Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ — 1 р. 70 к. „ 6 „ — 3 р. — к. „ 1 год — 6 р. — к. Зьмена адрэсу (перагародка) — 20 к. Месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпартнай часьці тэксту — р. 50 к. За тэкст пашпартнай часьці тэксту 1 р. — к. За радок пашпартнай часьці тэксту 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Знак тэрміну бярэцца 10 проц. тэксту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 к. За кожны дадатковы — 15 к. Бесперапыўн. і чырвонаграшовае за дакумент — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 242 (2731) Аўторак, 22-га кастрычніка 1929 г.

Загатоўка бульбы зьяўляецца баявой гаспадарча-палітычнай кампаніяй.

Мабілізуем шырокія колы савецкай грамадзкасьці для выкананьня пляну загатовак.

САВГАСЫ, КАЛГАСЫ, БЕДНАТА І СЕРАДНЯКІ, АРГАНІЗУЙЦЕ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ І ЗДАВАЙЦЕ БУЛЬБУ.

ВЫКАНАЕМ ПЛЯН ЗАГАТОВАК ДА ТЭРМІНУ, БО ЧАС НЕ ЧАКАЕ—НАДЫХОДЗЯЦЬ МАРАЗЫ.

Баявая задача.

Пытаньне загатоўкі бульбы набывае ў сучасны момант актуальнейшае значэньне. Загатоўка бульбы зьяўляецца ударнай, баявой гаспадарча-палітыкічнай кампаніяй. Справа ў тым, што па плянавых меркаваньнях да 15 лістапада з БССР павінна быць вывезена ў пралетарскія цэнтры—Маскву і Ленінград—4 міліёны пудоў бульбы з агульнага гадавога заданьня 6 міліёнаў, між тым да сучаснага моманту адгружана і адпраўлена ўсяго 250 т. пуд., што складае надзвычайна нізкі процант выкананьня заданьня.

З прыведзеных вышэй лічбаў магчыма зрабіць вывад, што загатоўка бульбы знаходзіцца пад пагрозай зрыву, калі не прыняць рашучых мер, калі не паставіць працу загатоўчых органаў на належную вышыню, калі не мабілізаваць вакол гэтай кампаніі шырокія пласты бедняцка-серадняцкіх мас сялянства. БССР павінна выканаць плянавыя заданьні па забясьпечаньню пралетарыяў Масквы і Ленінграду бульбаю, тым больш, што ўраджай бульбы ў гэтым годзе мы маем вусім здавальняючы.

Асноўнаю прычынаю невыкананьня плянавых заданьняў па загатоўцы і адпраўцы бульбы зьяўляецца нядбайнасьць загатоўчых арганізацый, неразуменьне імі ўдарнасьці гэтай кампаніі. Вось чаму зараз-жа неабходна зрабіць пералом ў загатоўчай кампаніі, трэба зрабіць рашучы націск на загатоўчы апарат і на ўсе рычагі арганізацыйнага грашовага і гаспадарчага ўплыву, каб загатоўка бульбы ішла пасьпяхова.

ЦК КП(б)Б мабілізаваў шэраг адказных працаўнікоў для пасылкі на месцы, каб забясьпечыць пасьпяховы ход загатоўчай кампаніі. Гэта-ж самае павінны зрабіць і акруговыя камітэты партыі. Вялікую дапамогу ў загатоўцы бульбы могуць аказаць прафесыянальныя саюзы шляхам пасылкі ў вёску рабочых брыгад, шырокага разгортваньня растлумачальна-агітацыйнай працы сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, шляхам арганізацыі чырвоных абозаў для калектыўнай здачы бульбы бядняцкаю і серадняцкую часткаю вёскі.

Асабліва вялікая адказнасьць па загатоўцы бульбы ўскладаецца на загатоўчы апарат. Загатоўчы апарат павінен выявіць максымум энэргіі і ініцыятывы, гібкасьці, каб за самы кароткі тэрмін атрымаць чайбольшы эфэкт у загатоўчай працы. Трэба рашуча павесьці барацьбу з ажыятажам, галавацяпствам, спэкуляцыяй на загатоўчым рынку. Загатоўчыя арганізацыі павінны выступіць адзіным фронтам, каб весьці пасьпяхова загатоўку і адгрузку бульбы.

Загатоўчая кампанія бульбы, зразумела, выкліча супраціўленьне кулака, які ўсімі мерамі будзе перашкаджаць пасьпяховасьці правядзеньня загатовак. Кулацкаму супраціўленьню мы павінны супроцьпаставіць магутны фронт бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, якія актыўна падтрымліваюць усе мерапрыёмствы партыі і ўлады і якія дапамагаюць іх ажыцьцяўленьню. Павінна быць узмоцнена барацьба і з прыватнікам, які імкнецца скупляць бульбу ў мэтах спэкулятыўных, чым дэзарганізуе рынак.

Пасьпяховы ход кампаніі будзе залежыць ад таго, як будзе працаваць загатоўчы апарат, як мясцовыя партыйныя і грамадзкія арганізацыі здолеюць мабілізаваць бядняцка-серадняцкія масы сялянства вакол загатоўчай кампаніі. Вось чаму дакладнасьць, хуткасьць, ініцыятыва працы загатоўчага апарату набывае вялізарнейшае значэньне поруч з задачамі масавай агітацыйнай і арганізацыйнай працы сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

БССР выканае свой абавязак перад маскоўскімі і ленінградзкімі таварышамі. Бязьлітасным ударам па кулаку і спэкулянту, якія дэзарганізуюць рынак, мабілізацыяй бядняцка-серадняцкіх мас вёскі вакол задач загатоўкі бульбы і ўзьняцьцем працы загатоўчага апарату—мы выканаем плян у тэрмін.

Трэба дабіцца яшчэ большага ўзмацненьня тэмпу загатовак бульбы.

Паводле пляну Савецкая Беларусь павінна будзе адправіць у Маскву і Ленінград 6 мільёнаў пудоў бульбы, прычым 4 мільёны пудоў трэба адправіць да 15 лістапада.

Нар. Камісарыят Гандлю БССР у свой час гэтае заданьне разьмеркаваў паміж арганізацыямі, якія вядуць загатоўку бульбы. З агульнай колькасьці даручана загатовіць Белкаапсаюзу 2 мільёны пудоў, Белсельсаюзу 1 з паловай міл. пудоў, Акц. т-ву „Продуктпереработка“ 1 з пал. міл. пудоў і «Плодацэнтру“ 1 мільён пудоў. Апрача таго Саюзхлебу даручана дадаткова да 15 XI загатовіць 630 тыс. п.

Трэба сказаць, што да апошняга часу загатоўчыя арганізацыі спалі, не разгарнулі належным чынам працу па загатоўцы бульбы.

Нават больш таго, у глубінных пунктах зусім ня думалі аб загатоўцы бульбы.

Па няпоўных яшчэ вестках адгрузка бульбы за апошнюю пяцідзёнку (з 15 да 20 кастрычніка) узмацнілася, але ўсё-ж тэмп загатовак і адгрузкі бульбы нас ні ў якім разе задаволіць ня можа. Нашым загатоўчым арганізацыям трэба сур'ёзна ўзяцца за разгортваньне кампаніі па загатоўцы бульбы, за сьпячку і нядбайнасьць у гэтым пытаньні трэба прыцягваць да адказнасьці. Дзе-ні-дзе паміж загатоўцамі на гнебе канкуренцыі ідзе сварка і ажыятаж на бульбяным рынку. З такімі хворымі зьявішчамі на загатоўчым фронце трэба раз на заўсёгды пакончыць. Шкоднікаў загатоўчай працы, якія павялічваюць цэны на бульбу, абы толькі зацягнуць селяніна на свой загатоўчы пункт, трэба біць па руках і прыцягваць да суровай адказнасьці.

У заключэньне неабходна адзначыць, што пытаньню загатоўкі бульбы да апошняга часу нашы загатоўчыя арганізацыі амаль зусім не ўдзялялі належнай увагі, навакол гэтага пытаньня ня была ўтворана грамадзкая думка. У апошні час па лініі ўсіх арганізацый ужо завострана ўвага на разгортваньні загатовак бульбы і вестка за апошнюю пяцідзёнку гавораць аб наступіўшым пераломе ў лепшы бок. Але на гэтым спыняцца і супакойвацца нельга. Трэба яшчэ больш разгарнуць тэмп загатовак, каб з гонарам выканаць абавязак перад рабочымі Масквы і Ленінграду.

Выканаць плян загатовак.

Заслухаўшы інфармацыю аб загатоўках хлеба і бульбы, першая нарада сакратароў калгаскіх і савгаскіх ячэек адзначае недастатковы тэмп разгортваньня хлебазагатовак, асабліва слабы тэмп загатовак бульбы. Яшчэ слаба мабілізавана актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас вёскі вакол важнейшай задачы сёньняшняга дня загатовак.

У той час, калі калгасы і савгасы павінны паказаць прыклад высокай сьвядомасьці і сваечасовага выкананьня сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай, мы маем яшчэ цэлы шэраг калгасаў, якія хаваюць і не здаюць сваіх лішкаў.

Выходзячы з таго, што сваечасовая і пасьпяховая загатоўка хлеба, асабліва бульбы, адносна якой Беларусь асноўны райён Савецкага Саюзу,—зьяўляецца важнейшай палітычнай задачай, выкананьне якой забясьпечыць далейшае пасьпяховае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, улічваючы, што палітыка партыі і савецкай улады па загатоўках сустракае ўчартае процідзейнічаньне капіталістычных элемэнтаў,—нарада сэкратароў пастанаўляе:

1. Зараз-жа прыняць усе патрэбныя меры да дакладнага вучоту ўсіх лішкаў хлеба, бульбы і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў 1 ў самым тэрміновым парадку здаць дзяржаўным загатоўцам і капэрацыі поўнасьцю на ўсе 100 проц.

2. Нарада лічыць неабходным мабілізаваць усю партарганізацыю да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні загатовак хлеба і бульбы ў ваколічных вёсках, праводзячы шырокую растлумачальную работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас, даводзячы пляны загатовак хлеба і бульбы да кулацкага двара, прымаючы самыя жорсткія меры да кулака, які не здае хлеб і бульбу і даючы рашучы адпор усякім спробам кулацтва сарваць загатоўкі.

3. Нарада ставіць сваёй важнейшай задачай да XII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі поўнасьцю выканаць пляны загатовак бульбы для пралетарыяў Масквы і Ленінграду. Для гэтай мэты нарада заклікае ўсю партарганізацыю рабочых савгасаў і калгасьнікаў зараз-жа разгарнуць энэргічную работу па здачы лішкаў хлеба і бульбы, праводзячы ўсю гэтую работу пад лёзунгам: „Савгасы і калгасы Беларусі аддадуць усе лішкі хлеба і бульбы пралетарыям нашых чырвоных сталіц—Масквы і Ленінграду“.

Загатоўка бульбы разгарнулася.

На вестках, атрыманых з месц Белсельсаюзам, загатоўка бульбы разгарнулася здавальняюча. На першым месцы па загатоўцы стаяць Бабруйская і Менскія акругі, на апошнім месцы—Гомельская і Аршанскія акругі.

Белсельсаюз мабілізаваў на гэту справу ўвесь свой апарат; апроч гэтага, да загатовак бульбы прыцягнуты і мясцовыя работнікі.

Бульба для патрэб гарадоў.

Белрабсэкцыя запрапанавала ўсім ЦРК, якія заключылі дагаворы на загатоўку бульбы з спажывецкай кааперацыяй, зараз-жа арганізаваць рабочыя дружыны і накіроўваць іх на месцы загатовак. Апроч гэтага, для ўдзелу ў гэтай кампаніі запрапанавана вылучыць працаўнікоў з сваіх апаратаў. Перад усімі ЦРК ставіцца задача актыўна разгарнуць кампанію па загатоўках, каб да пачатку маразоў скончыць яе.

Першы зьезд працоўных жанчын Нямеччыны.

Гучнымі воплескамі зьезд сустрэў прадстаўніцу СССР т. Сьцяпанаву. Зьезд абраў дэлегацыю для паездкі ў СССР на сьвяткаваньне ўгодак Кастрычніцкай рэвалюцыі.

БЕРЛІН, 21-X. Учора адбыўся першы агульнямецкі зьезд працоўных жанчын. На зьезьдзе прысутнічала 408 дэлегатак і 350 гасьцей. Пасьля прывітальняў рабочых дэлегатак Нарвэгіі, Францыі, Англіі, Аўстрыі і Чэхаславакіі і пасьля зачытаньня прывітальнай тэлеграмы міжнароднага жаночага сэкратарыяту Камінтэрну. Ад імя камуністычнай партыі і забароненага саюзу Чырвоных франтавікоў выступіў член ЦК КП Нямеччыны т. Тэльман, які падкрэсьліваў гістарычнае значэньне першага зьезду працоўных жанчын.

Дзелавая частка зьезду распачалася асноўным дакладам Алены Авэрлах, які быў прысьвечан пытаньню аб становішчы работніц і працоўных жанчын, іх барацьбе за заработак, барацьбе супроць беспрацоўя і супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны. Дакладчыца падрабязна спынілася на становішчы працоўных жанчын ва ўмовах рацыяналізацыі, узмоцненай эксплёатацыі, якая зьяўляецца вынікам пляну Юнга, і мытнай палітыкі казаліцыйнага ўраду.

Далей дакладчыца зазначыла на неабходнасьць энэргічнай барацьбы супроць капіталу, рэфармісцкай бюракратыі і фашызму, неабходнасьць заснаваньня інстытуту рэвалюцыйных упаўнаважаных на прадпрыемствах і інстытуту жаночых дэлегатак, скласьці акруговы камітэт працоўных жанчын, абраць баявы камітэты жанчын на прадпрыемствах, а таксама па неабходнасьць шырокага ўдзелу жанчын у чырвоных фабрычна-заводзкіх камітэтах.

Дакладчыца спынілася далей на вялічэзным значэньні СССР і Камінтэрну як піянэраў руху працоўных жанчыч і падкрэсьліла небясьпеку вайны супроць СССР.

Дыскусія пасьля дакладу адбывалася з вялікім ажыўленьнем пры пераважным удзеле беспартыйных жанчын амаль што з усіх галін прамысловасьці. Вялікі ўздым выклікала печаканае выступленьне прадстаўніцы СССР Сьцяпанавай, якая была спаткана бурнымі воплескамі і сьпевам „Інтэрнацыяналу“. Сьцяпанава ад імя жаночых дэлегатак СССР вітала працоўных жанчын Нямеччыны і зрабіла даклад аб посьпехах руху за разьвяволеньне жанчын у СССР, абумоўленых палітыкай УсеКП(б) і вялічэзным рэканструкцыйным плянам савецкай эканомікі.

Зьезд аднагодна ўхваліў балвую праграму, якая дакладна вызначае асноўныя лініі рэвалюцыйнай працы жанчын. Пад гучныя выгукі адобраньня зьезд ухваліў прывітальны ліст да працоўных жанчын СССР. Далей, зьезд абраў 3-х сяброў у жаночую дэлегацыю, якая павінна паехаць у СССР для ўдзелу ў кастрычніковых урачыстасьцях. Зьезд скончыўся сьпевам «Інтэрнацыяналу».

„Страна Советов“ у кветках.

САН-ФРАНЦЫСКА. 19-X. На аэрадроме Окленду (горад на ўсходнім узьбярэжжы затокі Сан-Францыска) самалёт „Страна Советов“ быў спатканы шматлікім натоўпам. Мэр гораду Окленду і прадстаўнік мэра Сан-Францыска перадалі лётнікам ключ ад горада. Пры спатканьні самалёт быў асыпаны кветкамі.

Да 2-й сэсіі ЦВК Саюзу ССР.

МАСКВА, 24-X. Склік 2-й сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР, які быў назначаны на 19-га лістапада 1929 г., пераносіцца на 28 лістапада.

Сэкратар ЦВК Саюзу ССР А. Энукідзэ.

Прывітаньне т. Сталіну.

БЭРЛІН, 21-X. Шырокая канфэрэнцыя бэрлінскага антываеннага камітэту паслала т. Сталіну тэлеграму, у якой гаворыцца, што некалькі соцень прадстаўнікоў бэрлінскіх прадпрыемстваў абмеркавалі плян разьвіцьця гаспадаркі СССР.

Канфэрэнцыя шле тав. Сталіну, як правадыру бальшавіцкай партыі і галоўнаму прадстаўніку генэральнай лініі рэвалюцыйнага пралетарыяту, а таксама нашаму таварышу па міжнароднай барацьбе, братняе прывітаньне.

Яны пакляліся прыкласьці ўсе сілы дзеля абароны СССР ад імпэрыялістычных ворагаў.

ДВУРУШНАЯ ПАЛІТЫКА ППС І БУНДУ.

РАБОЧЫЯ ВЫКРЫВАЮЦЬ ЗДРАДНІЦКІ ТВАР САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ

ВАРШАВА, 21-X. У нядзелю бундаўцы і пэпэсаўцы наладзілі ў Варшаве супольны мітынг у адным з тэатральных памяшканьняў. На мітынгу выступалі выдатныя дзеячы ППС і Бунду. Уваход у тэатр пільна вартаваўся пэпэсаўскімі і бундаўскімі дружыньнікамі з тым, каб ніводзін з левых рабочых ня трапіў на мітынг. Не зважаючы на гэта, у памяшканьне, дзе адбываўся мітынг, прабралася шмат левых рабочых, якія перарывалі прамоўцаў.

Абʼяднанымі натугамі пэпэсаўскіх і бундаўскіх дружын заля была вызвалена ад камуністычна настроеных рабочых.

На мітынгу была ўхвалена рэзалюцыя, у якой адзначаецца, што ўрад пілсудчыкаў—гэта незакізаная рэакцыйная ўлада капіталістаў і памешчыкаў. Лягер Пілсудзкага, зазначана ў рэзалюцыі, абʼяднае ўсе рэакцыйныя сілы ня толькі польскай грамады, але таксама яўрэйскай і нямецкай нацыянальных меншасьцяў.

Рэзалюцыя заклікае рабочую клясу незалежна ад нацыянальнасьці згуртавацца для барацьбы за зьнішчэньне сучаснай сыстэмы кіраваньня. Выступаючы з гэткімі «рэвалюцыйнымі» прамовамі і з яшчэ больш „рэвалюцыйнай“ рэзалюцыяй, лідэры ППС дамагаліся толькі таго, каб на мітынгу ня выступалі камуністы, якія выкрылі-б іх двурушную палітыку. Перад тэатрам сабраўся натоўп рабочых, які гвалтам хацеў прайсьці ў тэатр. Між рабочымі і дружыньнікамі здарылася рукапашная барацьба. На дапамогу дружыньнікам зьявілася неадкладна паліцыя, якая разагнала дэманстрантаў.

Разагнаныя паліцыяй рабочыя сабраліся каля памяшканьня бундаўскага партыйнага дому, дзе быў наладжан мітынг. У часе мітынгу рабочыя пабілі шыбы ў бундаўскім памяшканьні. Дэманстрацыя была ізноў разагнана паліцыяй. Разагнаныя паліцыяй дэманстранты сабраліся ў раёне Ціхай вуліцы, дзе была наладжана працэсія, якая накіравалася да астрогу Павяк. Да астрогу здолелі прабрацца некалькі сот рабочых. Каля памяшканьня астрогу рабочыя ізноў былі разагнаны паліцыяй.

Гэткі-ж мітынг як у Варшаве, быў склікан пэпэсаўцамі ў Львове. Левыя рабочыя на мітынг дапушчаны ня былі. Каля тэатру сабраўся вялікі натоўп левых рабочых, якія былі разагнаны паліцыяй.

Генэральскія бойкі ў Кітаі.

Перавага сіл на баку Гамінцьзюна.

ШАНХАЙ, 21-X. У Чжан-Сюэ-Ляна адбылася важная нарада па пытаньні аб савецка-кітайскім канфлікце. У нарадзе ўзяло ўдзел больш 50 кіруючых дзеячоў, у тым ліку афіцыйныя прадстаўнікі Нанкінскага ўраду. Пасьля нарады было абвешчана, што нанкінская ўлада будзе падтрымліваць Нанкінскі ўрад у сучасным крызісе, але ў сувязі са становішчам на Сунбэйскай мяжы яны ня могуць склікаць войска для ўдзелу ў кампаніі супроць Гамінцьзюну.

* * *

ПЭЙПІН, 21-X. Каля Лейяну (Хэнань) распачаліся ваенныя дзеяньні між нанкінскім войскам і Гамінцьзюнам. Згодна вестак, у першых бойках нанкінцы страцілі каля тысячы чалавек. У Ханькоу хватаюць на вуліцах кулі і вулічных гандляроў і накіроўваюць іх на фронт.

* * *

ПЭЙПІН, 21-X. Учора ў пэйпінскім цэнтральным парку адбыўся мітынг супроць Гамінцьзюну. Мітынг сабраў толькі 200 ч. і прайшоў вельмі вяла

* * *

ШАНХАЙ, 21-X. Ёсьць чуткі аб тым, што войска Гамінцьзюну захапіла Чэнчжоу (правінцыя Хэнань).

Гандляры чаем патрабуюць перамоў з СССР.

ШАНХАЙ, 21-X. Кітайскія гандляры чаем зьвярнуліся да міністэрства замежных спраў з заклікам распачаць перамовы з СССР з мэтаю наладзіць гандаль чаем.

У Саюзных Рэспубліках.

Тав. М. І. Калінін вярнуўся з водпуску.

МАСКВА. Старшыня ЦВК Саюзу ССР і Усерасейскага ЦВК т. М. І. Калінін вярнуўся з водпуску і распачаў выконваць свае службовыя абавязкі.

Канчатковыя вынікі прамысловай вытворчасьці за 1928-29 год.

МАСКВА, 21-X. ВСНГ СССР падсумаваў канчатковыя вынікі прамысловай вытворчасьці за мінулы 1928-29 год. Агульны абхват прадукцыі ўзрос сёлета ў параўнаньні з леташнім на 23,4 проц., замест 21 проц. згодна пляну і дасягнуў 11,9 міліярдаў рублёў супроць 9,7 міліярдаў.

Больш за ўсё ўзрасла прадукцыя цяжкай індустрыі—на 26,2 процанты. Лёгкая прамысловасьць павялічыла сваю прадукцыю на 21 проц.

Плян завозу і разьмеркаваньня мінэральных угнаеньняў на 1929-30 год.

МАСКВА. Наркамзем падаў на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады плян завозу і разьмеркаваньня мінэральных угнаеньняў на 1929-30 г. Завоз, у параўнаньні з леташнім, павялічваецца больш як у два разы: у 1928-29 г. было завезена 213 тысяч тон, у 1929-30 годзе прапанавана завесьці 502 тысяч тон.

Мінэральныя ўгнаеньні будуць выдавацца ў крэдыт на такіх умовах: савгасы, калгасы і бядняцкія гаспадаркі плацяць пры пакупцы 30 проц. задатку з растэрмінаваньнем рэшты грошай на 2 гады. Серадняцкія гаспадаркі плацяць 50 проц. з растэрмінаваньнем рэшты грошай на адзін год. Для закантрактаваўшых засевы гаспадарак задатак адпаведна зьніжаецца да 20 і 30 проц.

Выкрыта і ліквідавана контр-рэвалюцыйная арганізацыя.

МАСКВА, 21-X. Органы ДПУ выкрылі і ліквідавалі контр-рэвалюцыйную, шкодніцкую і шпіёнскую арганізацыю ў ваеннай прамысловасьці СССР.

Арганізацыя ставіла перад сабой задачы—праз шкодніцтва і шпіёнаж паслабіць абароназдольнасьць СССР і садзейнічаць чужаземным інтэрвэнтам. Складалася яна ў пераважнай большасьці з былых вышэйшых чыноў царскай арміі—былых генэралаў і палкоўнікаў.

У зьвязку з гэтым, калегія ДПУ прыгаварыла к расстрэлу: былога генэрала Лішаева, Высачанскага, Думмана, Дэханава, Шульга, былы генэрал-паручэнец пры б. вялікім князі Сяргеі Міхайлавічы.

Прыгавар выкананы.

Астатнія абвінавачаныя па гэтай справе прыгавораны на розныя тэрміны зьняволеньня ў канцэнтрацыйныя лягеры.

11 тыраж 10 проц. пазыкі 1927 году.

МАСКВА, 21-10. Адбыўся 11-ты тыраж 10-ціпроцантнай пазыкі 1927 г. Разыграна выйгрышаў на агульную суму 700 тысяч рублёў. У розыгрышы ўдзельнічалі аблігацыі ўсіх 20 сэрый, апроч аблігацый, якія выйгралі у мінулых тыражох. Выйгрыш у 50 тысяч рублёў прыпаў на аблігацыю 187067 сэрыі 16. Выйгрышы па 25 тысяч рублёў прыпалі на аблігацыі 59885 сэрыі 18, абл. 174247 сэрыі 12. Па 10 тысяч рублёў выйгралі. абл. 84394 сэрыі 3, абл. 49220 сэрыі 10, абл. 119929 сэрыі 20, абл. 182639 сэрыі 9, абл. 21063 сэрыі 18. Разыграна 10 выйгрышаў па 5 тысяч руб., 71 выйгрыш па тысячы, 252 выйгрышаў па 250 рублёў і 3660 выйгрышаў па 100 рублёў.

Кулакі падпалілі 2 калгасы і сарвалі мітынг.

СЬВЯРДЛОЎСК, 18-X. У «дзень ураджаю і калектывізацыі» ў адной з камун калгасу „Гиганта“ быў наладжан масавы мітынг з прысутнасьцю дэлегатаў Ірбіту і калгасьнікаў усяго райёну. Мітынг быў сарваны кулакамі, якія падпалілі адначасна два калгасы. Прысутныя на сьвяткаваньні прымушаны былі паразьяжджацца.

Дэфіцытныя тавары ў хлебазагатоўчыя райёны.

МАСКВА. Цэнтрасаюз СССР вылучыў спэцыяльны фонд дэфіцытных тавараў для хлебазагатоўчых райёнаў. З гэтага фонду выдаецца прэмія асобным вёскам, калгасам і сялянам, якія здаюць хлебныя лішкі ў павялічаных разьмерах. Кулацкім гаспадаркам дэфіцытныя тавары будуць выдавацца толькі пасьля поўнай здачы ва ўстаноўленыя тэрміны ўсіх лішкаў таварнага хлеба.

Выбары рабочых дэлегатаў для паездкі ў СССР.

Рабочыя заяўляюць аб гатоўнасьці рашуча абараняць СССР і ганьбяць урад Макданэльда.

ЛЁНДАН, 21-X. У Лёндане ў суботу адбылася канфэрэнцыя пралетарскіх арганізацый, на якой абрана 7 рабочых у дэлегацыю для падарожжа ў СССР на кастрычнікавыя ўрачыстасьці. На канфэрэнцыі прысутнічала 120 чалавек, якія прадстаўлялі 25 тысяч рабочых. На сходзе ўхвалена рэзалюцыя, якая заяўляе аб салідарнасьці з рабочымі СССР і аб цьвёрдай рашучасьці абараняць СССР, а таксама рэзалюцыя з ганьбаю палітыкі ўраду рабочай партыі. Палітыка прадстаўнікоў незалежнай рабочай партыі абараняць урад Макданальда спаткала востры адпор з боку прадстаўнікоў трэд'юніёнаў.

Намесьнік падышаха.

КАБУЛ, 19-X. Пастаянным намесьнікам падышаха назначан брат Надыр-хана шах Валі-хан. Думаюць, што ён будзе назначан старшынёю рады міністраў. Ва ўрадавых колах ёсьць думка, што шах Валі-хан будзе ажыцьцяўляць усе загады міністэрства замежных спраў.

16 партыя скончылася перамогай Алёхіна.

БЭРЛІН, 21-X. 16-я партыя шахматнага матчу на першынства міру скончылася перамогаю Алёхіна пасьля 56-га ходу. Становішча гульні: Алёхін —9 паловаю вочкаў, у тым ліку 1 выйграных, а Багалюбаў—6 з пал. і тым ліку 4 выйграных.

Вынікі чысткі і праверкі вясковых ячэек КП(б)Б.

Вынікі праверкі і чысткі вясковых ячэек пакладзен у аснову далейшай барацьбы за ідэёвую чыстату шэрагаў Ленінскай партыі.

Пастанова Пленуму ЦКК КП(б)Б.

I.

1. Пленум ЦКК КП(б)Б лічыць, што генэральная чыстка і праверка вясковых ячэек праходзіла ў адпаведнасьці з дырэктывамі лістападаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б), XVI Партканфэрэнцыі і XII-га Зьезду КП(б)Б і праводзілася на падставе шырока-разгорнутай самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Генэральная чыстка вясковых ячэек разам з тым была і генэральнай праверкай усёй партыйнай работы на вёсцы. Чыстка і праверка была ўспрынята і ацэнена ў асноўным усёй масай партыйцаў на вёсцы, беспартыйнымі рабочымі, батрацтвам, беднатой і лепшай часткай серадняцтва, як задача вялікай палітычнай важнасьці, і вынікам чаго было „сапраўднае імкненьне мас дапамагчы партыі ў правядзеньні гэтае вельмі важнае задачы ў справе ачышчэньня яе шэрагаў ад ідэйна і сацыяльна-чужых, разлажыўшыхся і абюракратаных элемэнтаў, якія нездольны і ня могуць праводзіць лінію партыі".

Генэральная чыстка і праверка вясковых ячэек КП(б)Б праводзілася лепшымі бальшавіцкімі кадрамі КП(б)Б.

2. Чыстка і праверка вясковых ячэек паказала, што вясковая частка КП(б)Б у пераважнай сваёй масе зьяўляецца здаровай, бальшавіцкі вытрыманай і здольнай праводзіць генэральную лінію партыі па соцыялістычнай перабудове вёскі. Чыстка паказала вялікі палітычны рост і актыўнасьць як унутры партыі, так і шырокіх беспартыйных рабочых, батрацкіх, бядняцкіх і лепшай часткі серадняцкіх мас вёскі, якая ў асноўным грунтавалася і адлюстроўвала ўсю абвостранасьць клясавай барацьбы на вёсцы. Імкненьням кулака і варожаму партыі элемэнту, спрабаваўшаму ўсялякімі спосабамі кампрамэтаваць партыю і лепшых камуністаў, вясковая беднота разам з лепшай часткай серадняцтва давала рашучы адпор.

Чыстка і праверка актывізавала масы і зьявілася штурмком па далейшаму разгортваньню самакрытыкі. Чыстка партыі ўзьняла адказнасьць усёй вясковай парторганізацыі і кожнага камуніста паасобку за выкананьне задач партыі на вёсцы, а таксама мабілізавала ўвагу ўсёй партыйнай масы для рашучай і бязьлітаснай барацьбы супроць канкрэтных насіцеляў права-апартуністычнага ўхілу на практыцы, супроць бюракратызму, скрыўленьня клясавай лініі ў рабоце на вёсцы, супроць хворых зьявішчаў і кулацкага перараджэньня. Чыстка вясковых ячэек яшчэ больш узьняла аўтарытэт партыі перад масамі беспартыйных рабочых, батрацтва і наблізіла гэтыя масы да партыі і шчыльней зьвязала іх з партыяй.

3. Поруч з гэтым Пленум ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што чыстка і праверка вясковых парторганізацый паказала незадавальняючы стан і вялікую засьмечанасьць цэлага апарату вясковых арганізацый, аб гэтым сьведчаць 14,2 проц. выключаных з партыі і 13,9 проц. атрымаўшых розныя спагнаньні, а таксама наяўнасьць, паводле матар'ялаў перапісу, сярод усяго складу вясковых камуністаў вялікай праслойкі кулакоў (1,52 проц.), якая даходзіла ў паасобных акругах да 2,9 (Полацак) і да 4,6 проц. (Віцебск). Чыстка выкрыла шматлікія выпадкі скрыўленьня клясавай лініі, п'яньства, зьмычкі асобных вясковых камуністаў з кулацкімі элемэнтамі, нежаданьне з боку шэрагу вясковых камуністаў ісьці ў калгасы, пасьмяны ўдзел, а ў некаторых выпадках і простыя процідзеяньні калектывізацыі, адарванасьць шэрагу вясковых камуністаў і нават асобных ячэек ад мас.

II.

Пленум ЦКК КП(б)Б канстатуе, што пралетарская частка вясковых парторганізацый аказалася найбольш устойлівай і здаровай, і што чыстка праходзіла, галоўным чынам, за кошт непралетарскіх элемэнтаў, якія падпадаюць пад загніваньне, аб чым сьведчыць тое, што ўдзельная вага выключаных служачых і сялян вышэй, чым група рабочых (вычышчана рабочых 7,7 проц., сялян—18,2 проц. і служачых—12 проц.), а ў групе сялян ачышчэньне ішло, галоўным чынам, за кошт кулацкіх і сацыяльна-чужых элемэнтаў, якія пралезьлі ў партыю з карыснай мэтай.

У выніку чысткі (па даных да разгляду апэляцый) КП(б)Б мае перасоўку якасных паказальнікаў у агульным асабовым складзе вясковых арганізацый у бок павялічэньня процанту ўдзельнай вагі рабочых на 2,3 проц. (29,3 проц. да чысткі і 31,6 проц. пасьля), зьмяншэньне проц. сялян на 2,6 проц. (да чысткі 55,7 проц. і пасьля—54,1 проц.) і нязначнае павялічэньне проц. служачых (14 проц. да чысткі і 14,3 проц. пасьля).

Прыведзены аналіз галоўных паказальнікаў вынікаў чысткі сьведчыць, што вясковыя арганізацыі пасьля генэральнай чысткі і праверкі сталі больш адзінымі, згуртаванымі і яшчэ больш здольнымі да правядзеньня задач партыі па соцыялістычнай перабудове вёскі.

5. Пленум адзначае, што, ня гледзячы на меўшыя месца ў паасобных арганізацыях недахопы, праверкомы пры дапамозе партыйных і беспартыйных мас складаную і адказную задачу па чыстцы і праверцы вясковых ячэек у асноўным выканалі. Побач з чысткай асабовага складу вясковых ячэек, праверкай усёй ячэйковай работы, выяўленьнем недахопаў у рабоце і дачай практычных прапаноў па зьнішчэньню выяўленых недахопаў, праверкомы таксама паказалі вясковым камуністам і арганізацыям на прыкладах чысткі, як трэба арганізоўваць беспартыйных рабочых, батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы вёскі для ажыцьцяўленьня задач партыі па рабоце ў вёсцы і для барацьбы са скрыўленьнем клясавай лініі, злоўжываньнем, бюракратызмам і цеганінай. Поруч з гэтым некаторыя праверкомы ў сваёй рабоце мелі шэраг такіх недахопаў, як няўвязка чысткі з праверкай усёй ячэйкавай працы, нездавальняючасьць вывадаў і прапаноў аб зьнішчэньні недахопаў у ячэйках, недастаткове вывучэньне і вучот актыўнасьці беспартыйных па сацыяльных групах, слабая праверка і афармленьне абвінавачваньняў і матар'ялаў чысткі, у зьвязку з чым ёсьць выпадкі значных зьмен пастаноў праверкомаў.

Адзначаючы ўсе гэтыя недахопы пленум ЦКК папярэджвае аб недапушчэньні гэтых недахопаў з боку праверкомаў у часе чысткі і праверкі савецкіх, вузаўскіх і вытворчых ячэек.

6. У шэрагу акруг у часе чысткі і праверкі вясковых ячэек з боку АКК і асабліва з боку АК ня было належнага жывога інструктаваньня і практычнай дапамогі праверкомам, асабліва ў пачатку чысткі, а таксама слабая праверка матар'ялаў чысткі, асабліва па праверцы работы ячэек. Некаторыя АК імкнуліся разгледаць справу чысткі, як справу выключна кантрольных камісій (Бабруйск, Мазыр, Полацак, Магілеў). У выніку гэтага пры разгортваньні чысткі і праверкі вясковых ячэек у шэрагу раёнаў ня была праведзена належная падрыхтоўка як саміх партыйцаў, так і асабліва беспартыйных рабочых, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас. Усё гэта ўскладняла работу праверкомаў і перашкаджала нармальнаму ходу чысткі і праверкі.

Пленум ЦКК прапануе кантрольным камісіям і камітэтам партыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на праверку падрыхтаванасьці савецкіх, вузаўскіх і вытворчых ячэек, мабілізуючы ўсе сілы на сталае, жывое кіраўніцтва і практычную дапамогу праверкомам і ячэйкам.

7. Адзначаючы наогул здавальняючую актыўнасьць партыйных і беспартыйных мас у часе чысткі вясковых ячэек і разуменьне імі задач чысткі і праверкі, Пленум ЦКК падкрэсьлівае пры гэтым нездавальняючы ў большасьці месц удзел камсамолу ў чыстцы і праверцы, і што з боку як ячэек, так і РК і часткі праверкомаў ня былі ўжыты адпаведныя меры да шырокага і рашучага разгортваньня самакрытыкі, а таксама і па арганізацыі актыўнасьці мас, асабліва батрацтва і беднаты, у выніку чаго ў часе чысткі і праверкі ў паасобных мясцох на праверсходах бедната і батрацтва ня былі арганізуючым асяродкам і на чале актыўнасьці.

Пленум канстатуе, што ў тых арганізацыях, дзе слаба была праведзена растлумачальная работа па ўяўленьню задач чысткі і праверкі і дзе ня была дастаткова разгорнута самакрытыка і ўнутрыпартыйная дэмакратыя, а таксама—дзе ў практычнай рабоце вясковых арганізацый замазвалася клясавая барацьба ў вёсцы, наглядалася недастатковая актыўнасьць саміх партыйцаў і беспартыйных, адмоўныя адносіны з боку некаторай часткі партыйцаў да ўцягненьня ў чыстку беспартыйных, замазваньне хваравітых зьявішчаў і кругавая парука, Пленум ЦКК лічыць гэткае зьявішча нецярпімым і даручае кантрольным і партыйным органам улічыць гэтыя недахопы пры далейшай чыстцы савецкіх, навучальных і вытворчых ячэек з мэтай іх недапушчэньня.

8. Ня гледзячы на тое, што ў ходзе праверкі і чысткі вясковых ячэек была шырока разгорнута самакрытыка, аднак Пленум ЦКК падкрэсьлівае, што ў большасьці вясковых арганізацый і да гэтага часу яшчэ ня створаны ўсе неабходныя ўмовы для шырокага разгортваньня самакрытыкі, і што ў шэрагу выпадкаў самакрытыка недастаткова дзейнічае на зьнішчэньне хваравітых зьявішчаў, з прычыны няўважлівых і нячулых адносін да крытыкі мас з боку партыйных арганізацый і кіраўнікоў вясковых устаноў. Больш таго, чыстка і праверка выкрыла шэраг фактаў поўнага неразуменьня асобнымі ячэйкамі важнасьці і задач самакрытыкі. Адсюль няўменьне арганізаваць яе і накіраваць на барацьбу з недахопамі ў вясковай рабоце і праверку клясавай лініі і бальшавіцкай устойлівасьці кіруючых працаўнікоў на вёсцы.

Пленум ЦКК лічыць зусім недапушчальным высьветленыя чысткай моманты замазваньня самакрытыкі і ў паасобных мясцох простага яе ўдушэньня і прапануе кантрольным камісіям і камітэтам партыі весьці з гэткімі зьявішчамі бязьлітасную барацьбу, а таксама праверяць пэрыядычна, як на практыцы адбіваюцца ў ячэйках ранейшыя пастановы партыі аб самакрытыцы.

9. Удзел друку ў справе праверкі вясковых ячэек быў недастатковы, асабліва бязьдзейнічалі насьценгазэты, якія ў шэрагу выпадкаў нават і не выдаваліся. Гэта зьяўляецца вынікам таго, што як рэдакцыі газэт, так асабліва РК і ячэйкі, а таксама і праверкомы не змаглі арганізаваць належным чынам навакол пытаньняў чысткі і праверкі рабкораў, селькораў і сьценкораў, і ня быў прыцягнуты да высьвятленьня ходу чысткі і праверкі ячэйкавы і раённы партактыў. Рэдакцыямі газэт амаль не практыкаваўся вопыт пасылкі на месцы сваіх прадстаўнікоў.

Пленум ЦКК абавязвае рэдакцыі як цэнтральных, так і акруговых газэт і партыйных арганізацый прыняць усе меры да ўзмацненьня сыстэматычнага асьвятленьня ў друку ходу чысткі савецкіх і вузаўскіх ячэек і падрыхтоўкі да чысткі вытворчых ячэек, высьвятляючы правадзімую ячэйкамі работу па выкананьні задач партыі па разгортваньню самакрытыкі па барацьбе з хваравітымі зьявішчамі і скрыўленьнем клясавай лініі, асьвятляючы таксама падрыхтоўку і ўцягненьне ў партыю перадавых рабочых.

10. Пленум ЦКК адзначае, як адзін з буйнейшых недахопаў, што падрыхтоўчая работа да чысткі і самы ход чысткі вясковых ячэек быў увязаны з вярбоўкаю ў партыю перадавых і лепшых рабочых, батракоў і беднякоў; больш таго, да пытаньня вярбоўкі ў партыю гэтых кадраў у шэрагу месц з боку РК і ячэек, а таксама і праверкомаў ня было дастатковай увагі, у выніку чаго ў некаторых раёнах ня быў прыняты ў партыю ні адзін батрак і бядняк (Тураўскі раён). Пленум канстатуе, што ў справе вярбоўкі ў партыю новых кадраў у большасьці округ пералому яшчэ няма і што вярбоўка рабочых, батракоў і беднякоў праходзіць не ў адпаведнасьці з магчымасьцю і наяўнасьцю гэтых кадраў.

Усё гэта зьяўляецца вынікам незразуменьня большасьцю ячэек пастаўленых партыяй задач па гэтаму пытаньню, слабой пастаноўкі масавай работы ў вёсцы і слабога ў шэрагу месц кіраўніцтва ячэйкавай работай з боку РК. Надаючы гэтаму пытаньню вялікае значэньне, Пленум ЦКК абавязвае ўсе парторганы прыняць хуткія і рашучыя меры за зьнішчэньня адзначаных недахопаў па пытаньню вярбоўкі ў партыю новых кадраў, дамагаючыся ад усіх вясковых ячэек поўнага выкананьня пастаўленых партыяй задач. Кантрольным камісіям праверыць выкананьне гэтых дырэктыў.

11. Чыстка і праверка вясковых арганізацый КП(б)Б выкрыла і паказала нездавальняючае становішча ў шэрагу райёнаў вясковых кадраў, аб чым сьведчыць значны процант выключаных і падпаўшых партспагнаньням у часе чысткі і праверкі адказных працаўнікоў працуючых у вёсцы, а таксама няўважлівыя адносіны з боку асобных парторганаў да падбору кадраў. Пленум ЦКК КП(б)Б прапануе АК і АКК у далейшым зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу, у прыватнасьці, на больш рашучае высоўваньне на адказную працу ў вёсцы сельска-гаспадарчых рабочых, батракоў і беднякоў; наладзіўшы папярэднюю падрыхтоўку іх да гэтае працы. Кіруючым і кантрольным партыйным органам сыстэматычна праверяць выкананьне дырэктыў вераснёўскага Пленуму ЦК КП(б)Б аб кадрах, адначасова практычна дапамагаючы вясковым ячэйкам КП(б)Б у справе выкананьня гэтай задачы.

12. Чыстка і праверка вясковых ячэек паказала, што далёка ня ўсе вясковыя камуністы зразумелі сутнасьць небясьпекі правага ўхілу. Барацьба з правым ухілам у практычнай рабоце не заўсёды праводзіцца рашуча. Пры гэтым на барацьбе з праявамі правага ўхілу ячэйкі і РК не заўсёды завастраюць увагу як паасобных камуністаў, так і ўсёй арганізацыі. Адсюль—слабы і абмежаваны ўдзел вясковых партыйцаў у калектыўным будаўніцтве, нежаданьне часткі вясковых камуністаў ісьці ў калгасы. Пленум ЦКК падкрэсьлівае таксама, што чыстка і праверка вясковых ячэек паказала надзвычайна нізкі палітычны ўзровень вясковых партыйцаў і яўнае неразуменьне многімі з іх задач партыі па вёсцы, усё гэта ставіць у парадак дню перад КП(б)Б задачу безадкладнага ленінскага выхаваньня вясковай часткі партыйцаў.

13. Чыстка і праверка вясковых ячэек са ўсёй рашучасьцю ставіць перад КП(б)Б задачу ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва ва ўсёй рабоце на вёсцы і асабліва ў рабоце КСМ і сярод жанчын, а таксама задачу інтэрнацыянальнага выхаваньня мас. Рашуча весьці барацьбу са зьявішчамі павярховасьці „штэмпляваньня", няўменьня весьці сапраўдную барацьбу з недахопамі і скрыўленьнямі клясавай лініі, адсутнасьці сыстэматычнай праверкі выкананьня партдырэктыў, якія недахопы маюць месца ў шэрагу вясковых партарганізацый і прыкладам чаго зьяўляюцца факты павярховага, а часам і не адпавядаючага сапраўднасьці ўяўленьня РК аб становішчы ячэек. Пленум ЦКК адначасова зварочвае ўвагу ўсёй КП(б)Б на неабходнасьць завастрэньня і правядзеньня самай рашучай барацьбы з хваравітымі зьявішчамі, выяўленымі ў часе чысткі з тым, каб разам са зьнішчэньнем гэтых балючых зьявішчаў сваечасова папярэджваць узьнікненьне і распаўсюджваньне іх у далейшым.

На выкананьне ўсіх гэтых задач павінны быць мабілізаваны ўсе сілы. Пленум ЦКК падкрэсьлівае, што неадкладная задача ўсіх кіруючых партыйных і кантрольных органаў—гэта замацаваньне ўзьнятай у часе чысткі і праверкі актыўнасьці беспартыйных рабочых, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і накіраваньне яе на перамаганьне ўсіх цяжкасьцяў сацыялістычнага будаўніцтва, на зьнішчэньне выяўленых чысткай і праверкай недахопаў у рабоце.

Пленум ЦКК КП(б)Б зварочвае ўвагу і абавязвае ўсе АК, РК і ячэйкі КП(б)Б улічыць і скарыстаць поўнасьцю матар'ялы чысткі і праверкі вясковых ячэек у штодзённай практычнай рабоце на вёсцы. Камітэтам партыі і кантрольным камісіям правяраць, каб прапановы праверкомаў у ячэйках былі ажыцьцёўлены поўнасьцю.

14. Улічваючы вопыт чысткі вясковых ячэек, кантрольныя камісіі, камітэты партыі і ячэйкі павінны ўжыць усе меры для правільнага правядзеньня чысткі савецкіх, вузаўскіх і вытворчых ячэек. Пры гэтым Пленум ЦКК зварочвае асаблівую ўвагу на рашучае разгортваньне самакрытыкі і барацьбу з кругавой парукай у часе чысткі і праверкі савецкіх і вузаўскіх ячэек.

Праверка гэтых ячэек павінна ператварацца ў генэральную праверку клясавай пралетарскай лініі савецкіх устаноў, камуністаў, якія працуюць у дзяржапараце, кіраўнікоў-партыйцаў, пастаўленых на чале гэтых устаноў, бязьлітасна выкрываючы ўсялякую гніль і разлажэньне, рашуча выкрываючы і вымятаючы з шэрагаў партыі тых, хто скрыўляе пралетарскую лінію і кампрамэтуе партыю. Улічваючы наяўнасьць шэрагу фактаў скрыўленьня клясавай лініі, асабліва ў вяменных, сельскагаспадарчых, крэдытных, фінансавых, судовых і саматужна-каапэрацыйных установах, трэба асабліва дакладна праверыць клясавую лінію і камуністычны твар усіх тых камуністаў, якія працуюць у гэтых установах... Уся работа ў справе праверкі і чысткі савецкіх і вузаўскіх ячэек павінна праходзіць пад знакам рашучага змаганьня як супроць права-апартуністычнай ідэалёгіі, практыкі і прымірэнцтва, так і супроць рэшткаў контр-рэвалюцыйнае трацкісцкае ідэалёгіі, асабліва супроць права-апартуністычнага ўхілу і прымірэнцтва, якія не складаюць проці усіх пастаноў партыі і Камінтэрну зброі змаганьня проці партыі і яе генэральнае лініі і зьяўляюцца на даным цяжкім этапе галоўнай небясьпекай для партыі". (Рэз. Пленуму ЦК КП(б)Б).

15. Улічваючы тое, што частка партыйцаў вясковых і вайсковых арганізацый па розных прычынах не прайшла чыстку і праверку, даручаецца АКК і ЦК ЦКК КП(ББ), поруч з чысткай савецкіх і вузаўскіх ячэек, бездадкладна арганізаваць праверку гэтых камуністаў. Пленум ЦКК даручае кантрольным камісіям арганізаваць хуткі разгляд апэляцый як вясковых, так і вайсковых арганізацый, не дапускаючы ў гэтай справе парушэньня 42 арт. інструкцыі аб чыстцы і праверцы.

16. Акруговым кантрольным камісіям дэталёва вывучыць і праверыць матар'ялы чысткі і праверкі вясковых парторганізацый з пункту гледжаньня правільнасьці выяўленьня гэтай работы і ў выпадку выяўленьня няправільнага правядзеньня чысткі і парушэньня інструкцыі аб чыстцы і праверцы—праводзіць паўторную чыстку.

На нарадзе сэкратароў савгаскіх і калгаскіх ячэек КП(б)Б.

Вызначаныя кантрольныя лічбы калектывізацыі выканаем з перавышэньнем. Партыйнае кіраўніцтва гаспадарчай дзейнасьцю савгасаў і калгасаў--цэнтральнае месца працы ячэек.

За большае аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці, за павялічэньне „недзялімых" капіталаў, за ўзбуйненьне калгасаў і за пераход да вышэйшай формы—камуны.

(Спрэчкі па дакладу тав. ГАНТМАНА аб чарговых задачах партыйнай, выхаваўчай і масава-палітычнай працы ў калгасах і савгасах).

За больш уважлівыя адносіны да добрых кіраўнікоў савгаспадарак.

Тав. Хрысанфаў. Савецкія гаспадаркі ў сёлетнім годзе маюць значныя посьпехі ў сваёй працы. Мы сёньня змаглі добра ўдарыць па індывідуальнай гаспадарцы, але ў нашай працы, у працы савгасаў і калгасаў наогул ёсьць цэлы шэраг адмоўных бакоў.

Першае пытаньне—наконт камандзнага складу, аб якім крыху ўспамянуў т. Гантман. Хочацца спыніцца на такіх момантах, калі мы ня добра, ня зусім так, як гэта патрэбна, адносімся да добрых кіраўнікоў савгаспадарак і за дробязь пачынаем прасьледаваць.

Вось нядаўна быў такі факт: у Аршанскім акрузе на аднаго кіраўніка савгасу было пададзена 82 заявы. Калі на месца выехала камісія, то выявілася, што ўсе 82 заявы былі напісаны па чутках, па гутарках, і ніводная заява не пацьвердзілася.

Далей, у Віцебскай акрузе ў савгасе „Крынкі", быў кіраўнік т. Вансбут. Ніводзін год у яго ня было страты, гаспадарка расла, але знашліся бузацёры, якія выжылі т. Вансбута. Што мы маем на сёньня ў гэтай гаспадарцы? На 1929-30 г. новы кіраўнік складае каштарыс з 25000 стратай.

Што гэта значыць? Гэта значыць, што ў паасобных выпадках мы робім памылкі. Я зусім ня зьбіраюся абараняць тых, якія не адпавядаюць свайму прызначэньню. Ёсьць выпадкі, калі абараняюць нягодных. Калі мы зьнімалі т. Данілава, у якога ня было дысцыпліны, у якога каровы дохлі—то яго абаранялі, а зараз другі савгас пляве разам з ім. Такія выпадкі няглыбокага падыходу да камандзнага складу трэба спыніць.

Мы не спаткалі добрага падтрыманьня з боку паасобных калектываў савгасаў да нашага вылучэньня новых кіраўнікоў.

Я лічу, што з кіраўнічым складам у нас абстаіць ня зусім добра. Але гэта работа складаная і ў гэтым напрамку трэба будзе згуртаваць увагу і вычысьціць тых, каго сапраўды трэба вычысьціць, каб яны потым не атрымалі нідзе ніякай працы.

Сацыялістычнае спаборніцтва ў нас праходзіць пакуль што недастаткова, ня так, як належыць. Мы мелі на май месяц з 161 адміністрацыйных адзінак толькі 51, якія ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва. Толькі на гэтым тыдні паасобныя савгасы ў Менскай акрузе падпісалі ўмову на сацыялістычнае спаборніцтва. Яны прыслухоўваліся, усё шчупалі, па якому шляху ісьці. Нам трэба сацыялістычнае спаборніцтва разгарнуць.

Тав. Гантман гаварыў, што на прамысловасьці—на фабрыках і заводах гэта справа разгорнута, а ў нас не. Гэта справа не пастаўлена на належную вышыню.

У тых савгасах, дзе было добра пастаўлена сацыялістычнае спаборніцтва, мы маем добрыя вынікі. У савгасе „Натальёўка" сваечасова заключылі ўмовы на сацыялістычнае спаборніцтва: там узьнялі прадпысьпліну і вытворчасьць працы.

Мне хочацца спыніцца на вытворчай дысцыпліне ў нашых калгасах. Мы маем у гэтых адносінах вельмі значныя разыходжаньні. Я вам прывяду два крайнія прыклады. Савгас „Ружамполь", Койданаўскага раёну, Менскай акругі, трацінь на адзін гэктар 13,8 чалавека-дзён, а ў Мазырскай акрузе савгас „Дарашэвічы" на адзін гэктар трацінь 97 чалавека-дзён, а гэтым савгасам кіруе актыўны член партыі.

Справа з расходваньнем рабочай сілы пастаўлена кепска. У савгасе „Оўсэа-Рудня" так пастаўлена работа: сёньня полюць 40 кв. саж. 8 чалавек, а заўтра на гэтай-жа рабоце занята 25 чал., сёньня авёс выпалываюць 1 з пал. гектары 5 чалавек, а заўтра—15 чалавек. Сэкратар ячэйкі, кіраўнік—член партыі, вытворчая нарада—ня бачылі, што ў іх тут робіцца.

Няма ніводнага калгасу, каб была адпаведная прадукцыйнасьць працы, а гэта мае для нас вялізарнае значэньне.

Згодна норм, устаноўленых навучальнымі ўстановамі і практыкай, мы павінны расходаваць на адзін гэктар 20 чалавекадзён, а мы расходавалі 37, а гэта на 43 тысячы гэктараў па 17 чалавек—колькі гэта лішняга каштуе дзяржаве?

Нам прадставілі каштарысы і пляны на 1929-30 г. Там вялікая разьбежка ў траце рабочай сілы—ад 39 да 7 чалавек на гэкт

Тав. ПРЫКОЦЕНЬ.
Калхоз імя Дзяржынскага, Плешчаніцкі райён.

Тав. РЭЗЬНІКАВА.
Калхоз „Нэйэр Лебэн" Смалявіцкага райёну, Менскай акругі.

Проста кіраўнікі ня былі зацікаўлены ў складаньні гэтага каштарысу, ня гледзячы на настойлівыя патрабаваньні з боку цэнтральнага праўленьня саюзу, каб каштарысы былі прагледжаны вытворчай нарадай.

Пасьля нашай нарады па гэтаму пытаньню з гэтага моманту мы павінны зрабіць рашучы пералом у нашым гаспадарчым жыцьці і яго будаўніцтве. За кожную капейку, за кожны крок рацыяналізацыі нашай работы мы павінны павесьці барацьбу. У гэтым напрамку мы зможам у далейшым весьці работу лягчэй, чымся да гэтага часу.

Узьняць культурную працу.

Тав. Штэйнгард. Упяршыню ЦК партыі склікае нараду низавых працаўнікоў савгасаў і калгасаў. Галоўны момант нарады—павінна быць праверка выкананьня дырэктыў партыі. Усё тое, што гаварыў дакладчык сёньня нам вядома, але нам нічога дакладчык не сказаў, што райком і АК зрабілі на працягу году.

Адным з слабых месцаў у нас зьяўляецца тое, што за скрыўленьне лініі партыі, за няправільнае правядзеньне лініі партыі той або іншы працаўнік партыі або цалкам арганізацыя не панесьлі моцнай кары.

Аб культрабоце ў калгасах. Я лічу, што гэта пытаньне такое-ж хворае, як і кіраўніцтва. Тут таварышы гаварылі, што ў калгасных ячэйках знаходзяцца зусім няпісьменныя, ня толькі палітычна няпісьменныя. І такіх таварышоў прыходзіцца ставіць на кіраўнічую працу ў калгасах, якія сёньня ўтвараем, і якімі мы павінны перамагчы ўсе цяжкасьці. Але як праводзяць гэтую працу даныя таварышы?

Рэлігія—супроць калектывізацыі. Сёньня рэлігія выступіла-б са зброяй у руках, калі-б яна толькі магла, супроць савецкай улады, але савецкая ўлада настолькі моцна, што яна можа весьці адкрытую барацьбу з рэлігіяй.

Адна з асноўных работ—работа сярод жанчын.

У нашай ячэйцы так ставіцца пытаньне. Давайце вылучыць жанарганізатара. Давай Мітрапонава—ён зможа да жанчын падысьці. Прашоў год—і ён нічога не зрабіў.

Даставіць літаратуру.

Тав. Амельяняў. Я тут хацеў сказаць некалькі слоў аб палітасьвеце на вёсцы ў калгасах. Гэта справа ня добра абстаіць, бо ў нас няма такіх агітпрапаў, якія маглі-б праводзіць работу, каб палітычна выхоўваць камуністаў і беспартыйных.

Ня вельмі добра ў нас абстаіць у цёмных кутках справа з літаратурай. Узяць хоць-бы Бешанковіцкі раён; там вы ніколі ў кнігарні ня знойдзеце літаратуры для палітасьветнай работы. Прайшоў XII зьезд КП(б)Б, вераснёўскі пленум, а матар'ялаў няма. Што з газэты даведаўся, тое і ёсьць. Калі выпісваем літаратуру, дык яе нам не прысылаюць.

Аб самаадукацыі. За гэту справу трэба лепш узяцца, але патрэбны сродкі. Я лічу, што для таго, каб на вёсцы правесьці работу, трэба паслаць больш моцных працаўнікоў, патрэбны кіраўнікі і трэба, каб партарганізацыі накіроўвалі з гораду таварышоў, каб яны дапамагалі будаўніцтву на вёсцы. У горадзе на прадпрыёмствах партарганізацыі лепш працуюць, бо яны мацней і ў культурных адносінах, чым на вёсцы.

Усіх камуністаў-сялян—у калгасы.

Тав. Мельнікаў: Мы гаворым, што кожны камуніст, які мае гаспадарку на вёсцы,

Тав. ІВАШКЕВІЧ.
Савхоз „Межава" Аршанскае акругі.

павінен уступаць у калгас. Мы бачым, што калі пачынаюць арганізоўвацца калгасы, а камуніст ня хоча ісьці туды, дык ён ідзе ў горад, атрымоўвае там работу праз райком, а іншы нават запішацца ў калгас, але толькі фармальна, і ня прымае ніякага ўдзелу ў калгасе. Пры чыстцы партыі шмат гаварылі аб гэтых камуністах, якіх трэба было, на мой погляд, выключаць з партыі. Партыйныя органы і тыя камісіі, якія праводзілі чыстку, ня прымалі належных мер у адносінах да тых паасобных членаў партыі, якія сёньня яшчэ не зьяўляюцца членамі калгасаў. Мы сёньня павінны адзначыць, што тыя працаўнікі, якія працуюць у горадзе, а на вёсцы маюць сваю гаспадарку, павінны пайсьці на вёску і там арганізоўваюць калгас.

Перад намі стаяць вельмі складаныя задачы. Нам трэба падрыхтаваць кадры і ўтварыць гэтыя кадры. Дзеля гэтага нам трэба на зімовы час арганізаваць гурткі, школы, выхоўваючы праз гэтыя школы нашых камуністаў, разгарнуць сетку палітычнае адукацыі, ліквідуючы ня толькі звычайную няпісьменнасьць, але разгортваючы веды, якія патрэбны для арганізатара буйнага калгасу. Калі прыехалі і запыталіся ў сэкратара савгаскай ячэйкі, ці ёсьць у іх радыё, дык ён адказаў „ёсьць", а ці гаворыць—„не, маўчыць". На вёсцы сёньня няма кіраўнікоў, якія маглі-б паправіць гэта радыё, калі яно папсуецца. Мне здаецца, што трэба ўтварыць спэцыяльныя тыднёвыя курсы для нашых хатнікаў, для сэкратароў партыйных ячэек, каб навучыць іх, як паправіць радыё, калі яно стала і г. д.

Дакладчык таксама адзначыў, што калгасны рост дапамагае росту партыйнай арганізацыі. Гэта правільна. Але мы бачым, што калі мы пачынаем расьці за кошт калгасаў, дык або райком марыцуе або акругком марыцуе і кажа, што нам патрэбна мець на ўвазе рэгуляваньне.

Далей, трэба паставіць пытаньне наконт каморнікаў. У нас тут вельмі дрэнна абстаіць справа. Вось у Жлобінскім райёне нават бываюць выпадкі, што калі ў калектыў запішацца 40-60 чалавек, то прадстаўнік, які прыехаў на вёску, лічыць, што тут ужо ўтворан калгас, але на паперы арганізаваць яшчэ ня значыць, што ён утворан на справе. На мой погляд, трэба рабіць так: зараз-жа калі толькі мы дабіліся таго, каб 70 ці 80 чалавек запісаліся ў калгас, трэба тут-жа накіраваць туды земляўпарадкавацеля, каб ён правёў земляўпарадкаваньне, тады мы хутчэй зможам калектывізаваць вёску.

Трэба павярнуцца тварам да савгасаў і калгасаў.

Тав. Нізоўцаў. Таварыш Гантман у сваім дакладзе адносна кіраўніцтва калгасамі і савгасамі сказаў, што райком зварочвае мала ўвагі, але я хачу да гэтага дадаць, што і АК таксама мала зварочвае ўвагі і пажадала, каб у далейшым у нас практыкаваліся такія нарады пры АК; таксама трэба заслухоўваць справаздачы па асобных ячэйках і даваць дырэктывы. Такім чынам, мы будзем мець цесную жывую сувязь і будзем сваечасова бачыць і падкрэсьліваць тыя непарэўменьні, якія ёсьць у працэсе работы ячэйкі калгасаў і савгасаў.

Для таго, каб мець у калгасах і савгасах ячэйкі, дык, зразумела, на гэта трэба вьвярнуць увагу нашым партыйцам, якія знаходзяцца на працы ў вёсцы.

Мне здаецца, што паасобным партыйцам, якія працуюць, скажам, у хаце-чытальні ці ў РВК ня шкодзіць, каб яны кіруючы хатай-чытальняй, дапамагалі ў рабоце калгасаў.

На сёньнешні дзень на гэта пытаньне трэба зьвярнуць увагу і сказаць наогул партыйцам, якія знаходзяцца на вёсцы, каб яны павярнуліся тварам да калгасаў, да камун, і тады мы ахопім тую працу, якая зараз ставіцца нашай партыяй.

Нам трэба падкрэсьліць тое, што часта калгасьнікі-партыйцы перагружаюцца, што дрэнна адбіваецца на працы. Скажам, той ці іншы таварыш здольны працаваць на каапэрацыйнай лініі, а яго адрываюць на доўгі час на іншую працу, а пасьля варочаюць зноў назад.

Вырашыць пытаньне кадраў

Тав. Дамаскароў. Тав. Гантм спыніўся на тым, што няма кіраўнікоў у савгаскіх ячэйках. Я думаю, што даўно ўжо трэба было падумаць аб тым, што кіраўнікоў вельмі няшмога, і што ніхто ня хоча ісьці ў вёску кіраваць. Мы ведаем, што ў 1927 г. была мабілізацыя работнікаў з гораду ў вёску, а колькі з іх там засталося? І вядома, што ўсе па тых ці іншых прычынах разьбегліся. Я ведаю многіх таварышоў, дзе яны працуюць зараз.

Тут гаварылі аб узмацненьні калгасных і савгасных ячэек. Я ведаю, што ў Гомельскай акрузе мабілізавалі 70 чалавек для пасылкі ў савгасы. І мала хто з гэтых хлопцаў згадзіўся.

Шніцэр. Мы канстатавалі, што мала аддавалі ўвагі пытаньням вядзеньня работы з беднатой. І таму, што ў нас работа з беднатой вялася слаба, мы часта не маглі сваечасова і правільна ажыцьцявіць нашыя задачы і правесьці іх такім парадкам, які нам намячала партыя.

Ёсьць цэлы шэраг пытаньняў, па якіх бедната ня ў курсе справы.

У нас часта партарганізацыі недастаткова зварочваюць увагу на пасылку работнікаў у вёску. Сустракаецца такое становішча, што сэкратар ячэйкі сядзіць у вёсцы больш году і літаральна нічога не зрабіў. Беднаты ў нас лічыцца вельмі многа, але калі мы пачалі прагледзець сьпіс беднаты, то выявілі, што ў сьпісах беднаты ёсьць цэлы шэраг заможных асоб, якія карысталіся ўсімі прывілеямі беднаты.

Калі мы праводзілі земляўпарадкаваньне, то быў цэлы шэраг спрэчак, якім парад

СУД ІДЗЕ НА ПРАВЕРКУ.

Народны Камісарыят РСІ пачынае праводзіць абсьледваньне і праверку работы органаў юстыцыі.

Абсьледваньне павінна выявіць, наколькі суд і пракуратура ажыцьцяўляюць рэвалюцыйную законнасьць і праводзяць клясавую пралетарскую лінію ў сваёй працы.

РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ ГОРАДУ, БАТРАКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЁСКІ ПАВІННЫ ДАПАМАГЧЫ НК РСІ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ АБСЬЛЕДАВАНЬНЯ І ПРАВЕРКІ СУДУ І ПРАКУРАТУРЫ.

ДАПАМОЖАМ ПРАВЕСЬЦІ АБСЬЛЕДАВАНЬНЕ.

Фронт клясавай барацьбы разгортваецца. Посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, рашучы наступ на капіталістычныя элемэнты ў горадзе і вёсцы, зразумела, знаходзяць супраціўленьне з боку нэпмана і кулака. Апошнія вядуць і скрытую і яўную барацьбу супроць мерапрыёмстваў савецкай улады, вядуць барацьбу супроць асобных прадстаўнікоў савецкай ўлады і супроць цэлых калектываў, аб'яднаньняў і арганізацый, якія праводзяць на мясцох палітыку партыі і ўраду. Кулачво ў вёсцы падпальвае калгасы, забівае актыўных калгасаўцаў, актывістаў сельсавету, нэпманскія і іншыя варожыя сілы ў горадзе ўтойваюць сваю прыбытковасьць, распаўсюджваюць плёткі, падрываюць дзейнасьць асобных арганізацый.

Барацьба супроць усяго гэтага ў нас вядзецца пя мэтадам вайсковага прыдушэньня, а праз нашы судовыя арганізацыі, праз суд, праз пракуратуру.

Таму асабліва важна, каб у перыяд абвостранай клясавай барацьбы наш суд і наша пракуратура былі асабліва пільнымі да нашых клясавых ворагаў, да ўсіх выступленьняў кулака і нэпмана, якія імкнуцца сарваць частку, ці якую-небудзь галіну нашага будаўніцтва.

Для гэтага патрэбна, каб увесь апарат суду і пракуратуры быў бязумоўна чысты ад усякіх насосаў, каб ён быў абсалютна клясава вытрыманы.

Трэба, каб наш суд і пракуратура, якія стаяць на варце рэвалюцыйнай пралетарскай законнасьці, былі пазбаўлены ад усіх бюракратычных выкрыўленьняў, ад усяго чыноўніцкага, ад усяго варожага пралетарыяту.

У асноўным наш суд і пракуратура задачы, пастаўленыя перад імі савецкай уладай, выконваюць добра, але і на гэтым фронце мы мелі шмат прарываў. Усе памятаюць справы мазырскіх, полацкіх, віцебскіх і іншых пракураў і судзьдзяў, в гэтых спраў відаць было, што ў памянёных судох і пракурорскіх вучастках былі выкрыўленьні клясавай лініі, былі бюракратызм, падхалімства, укрывацельства, былі хабары і разлажэньне. Уся савецкая грамадзкасьць асудзіла ўчынкі памянёных працаўнікоў, апошнія панесьлі заслужаную кару.

Але нельга сказаць, што пасьля таго наш судовы і сьледчы апарат вусім чысты. Не. І цяпер ёсьць шмат яшчэ фактаў выкрыўленьня клясавай лініі ў органах суду і пракуратуры. Факты мо' і найдрабнейшыя, але яны ёсьць.

Задача савецкае грамадзкасьці выявіць такія факты. Усякае выкрыўленьне клясавае лініі ў рабоце суду і пракуратуры павінна быць спынена адразу і падрозана ў корані. Тое абсьледваньне і праверка работы суду і пракуратуры, якое намечана для правядзеньня НК РСІ, павінна будзе выявіць якраз пытаньні аб тым, як ажыцьцяўляецца рэвалюцыйная законнасьць, як праводзіцца клясавая лінія ў рабоце судова-сьледчага апарату БССР. Абсьледаваны будуць—Народны Камісарыят Юстыцыі, Пракуратура рэспублікі, Вярхоўны суд, акруговыя суды і акруговыя пракуратуры; таксама будзе абсьледавана: адзін гарадзкі сьледчы, судовы і пацыянальны вучастак, адзін судвыканаўца, таварыскі суд і спраўдом—у акругах.

У райёнах будуць абсьледаваны два вучасткі нарсуду, адзін сьледчы і пракурорскі вучастак, 2 сельскія суды, 2 РВК і 2 сельсаветы—па частцы агульнага нагляду з боку пракуратуры.

Гэта абсьледаваньне павінна выявіць, як органы юстыцыі вядуць барацьбу з бюракратызмам, валакітай, безгаспадарчасьцю, скрыўленьнямі дырэктыў партыі і ўраду.

Гэта абсьледаваньне павінна выявіць, наколькі пракуратура і суд разгарнулі работу ў напрамку барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі, якія перашкаджаюць сацыялістычнаму будаўніцтву, якія процідзейнічаюць савецкім законам.

А таксама гэта абсьледаваньне павінна выявіць, наколькі суд і пракуратура замацавалі сувязь рабочых гораду з батракамі, беднякамі і сераднякамі вёскі. Вылучэньства, работа з засядацелямі, даклады суду і пракуратуры на рабочых і сялянскіх сходах—усе гэтыя моманты павінна выявіць абсьледаваньне.

Для таго, каб гэта работа была праведзена поўнасьцю, і каб былі лепшыя вынікі, трэба, каб у гэтай справе ўзялі ўдзел усе рабочыя, усе беднякі, батракі і серадняк. Трэба, каб апошнія ведалі, што такое абсьледаваньне праводзіцца, трэба думку апошніх згрупаваць вакол гэтага абсьледаваньня. Трэба, каб уся савецкая грамадзкасьць адгукнулася на ініцыятыву РСІ ў справе праверкі работы ўсяго апарату юстыцыі.

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь" прадастаўляе на час абсьледваньня яшчэ больш месца на старонках газэты пытаньням работы органаў юстыцыі. Рэдакцыя чакае ад усіх рабочых і служачых, батракоў і беднякоў матар'ялаў, якія асьвятлялі-б работу суду і пракуратуры. Гэтыя матар'ялы дапамогуць РСІ правесьці абсьледаваньне як найлепей.

Як будзе праводзіцца абсьледваньне і праверка.

У бліжэйшыя дні ЦКК НК РСІ БССР распачынае абсьледваньне і праверку дзейнасьці суду і пракуратуры ў напрамку ажыцьцяўленьня імі рэвалюцыйнай законнасьці і правядзеньня ў сваёй практычнай працы клясавай лініі.

Абсьледваньне цэнтральных органаў, а таксама органаў Гомельшчыны, Мазыршчыны і Полаччыны будзе праведзена спэцыяльнай цэнтральнай камісіяй ЦКК—НК РСІ пад старшынствам члена прэзыдыуму ЦКК. Камісія гэта падзеліцца на тры групы і будзе праводзіць абсьледваньне адначасова ў трох акругах.

У Менішчыне, Бабруйшчыне, Аршаншчыне, Віцебшчыне і Магілеўшчыне абсьледваньне будзе праводзіцца спэцыяльнымі камісіямі НК РСІ, у склад якой будуць уваходзіць, апрача прадстаўніка НК РСІ, прадстаўнікі акружвай пракуратуры, акрсуду акрпрафсавету і ДПУ.

Пасьля абсьледваньня вызначаных аб'ектаў камісіі падагульваюць матар'ял робяць свае вынікі, якія будуць абгаварвацца на сходах рабочых, або сялян і працаўнікоў абсьледваных устаноў. На час абсьледваньня арганізуецца крыём скаргаў і наведвальнікаў, для правядзеньня абсьледваньня будзе складацца рабочая праграма, якая будзе абгаварвацца ў рабочых брыгадах.

На час праверкі і чысткі цэнтральных і акруговых органаў юстыцыі да іх будуць прымацаваны саюзы скурнікаў і хімікаў.

На сходах гэтых прадпрыёмстваў перад пачаткам абсьледваньня той ці іншай установы будуць ставіцца даклады аб мэтах абсьледваньня, удзелу ў апошнім прафсаюзаў. Разам з тым рабочыя на гэтых-жа сходах будуць абгаварваць даклад кіраўніка той установы, якая будзе абсьледвацца, аб становішчы працы ў ёй.

На гэтых-жа сходах будуць абіраццa рабочыя брыгады для непасрэднага ўдзелу ў абсьледваньні.

У райёнах будуць склікацца сходы прафактыву і камсамолу, а ў сельсаветах сходы беднаты, батрацтва і вясковага актыву, на гэтых сходах таксама будуць рабіцца адпаведныя даклады аб мэтах абсьледваньня і праверцы і будуць абірацца брыгады для ўдзелу ў гэтай працы. У гарадох і райёнах у час абсьледваньня будуць склікацца сходы нарзасядацеляў і рабселькораў. На сходах нарзасядацеляў пасьля абгаварэньня дакладаў аб мэтах абсьледваньня будуць абірацца брыгады для праверкі хуткасьці праходжаньня і вырашэньня скаргаў у абсьледуемых установах, а на рабселькораўскім сходзе таксама будзе абірацца брыгада для праверкі становішча самакрытыкі і рэагаваньня на заметкі ў друку ва ўстанове, якая абсьледуецца.

Да працы па абсьледваньню і праверцы будуць прыцягвацца члены сэкцыі РСІ, лёгкая кавалерыя і грамадзкія арганізацыі тых устаноў, якія абсьледуюцца.

АГІДНАЯ ГІСТОРЫЯ З ПРАКТЫКІ МЕНСКАЙ АКРПРАКУРАТУРЫ

Мы патрабуем перагляду справы праф. Яцэнтоўскага.—Вінаватыя ў растраце дзяржаўнай маемасьці павінны быць пакараны.—Мы патрабуем прыцягнуць да адказнасьці валакітчыкаў з менскай пракуратуры.

Нашаму чытачу прафэсар Е. В. Яцэнтоўскі вядомы па фальетонах—«Дагестан на Беларусі» і „Про что поют нам петухи", што ў свой час былі вымешчаны ў нашай газэце.

Прафэсар Яцэнтоўскі працаваў на Беларусі 7 год—з 1922 году. Сем год прабываньня паважанага вучонага ў Савецкай Беларусі прайшлі ў мірных абставінах працы адносна... «Сусликов в Белоруссии".

Ведаем мы праф. Яцэнтоўскага і па працы—„Изучение микроорганизмов патогенных для вредителей сельского хозяйства и выяснение условий их применения". Мы напомнім чытачом, што гэту апошнюю працу паважаны прафэсар—ён-жа дырэктар дасьледчай станцыі—выконваў па заказу Наркамзему РСФСР для Дагестану, але каб менш патраціць часу і больш „зашибить деньгу", Яцэнтоўскі ўнёс гэтае пытаньне ў плян працы дасьледчай станцыі. Нейкія Мітрафанушкі з НДІ плян зацьвердзілі, і праца ішла належным парадкам, хоць для БССР яна была патрэбна так, як рукавіцы ў чэрвені.

Усё гэта ў свой час выкрыла наша рабоча-сялянская інспэкцыя; больш таго, апошняя выкрыла яшчэ некаторыя дробязі з пануковай дзейнасьці паважанага прафэсара. Нават ня дробязі, а проста глупства... Маленькі недахоп розных рэчаў станцыі і некаторыя іншыя „художества" прафэсара, якія каштавалі дзяржаве ўсяго толькі... 3100 руб.

Безгаспадарчасьць і растрата дзяржаўнай маемасьці, рвачаства і скарыстаньне станцыі аховы расьлін у вузка ўласных інтарэсах,—вось заслугі прафэсара Яцэнтоўскага ў яго „плодотворной" працы на карысьць Савецкай Беларусі.

Трэба сказаць, што яшчэ ў кастрычніку 1928 году дырэкцыя Навукова-Дасьледчага Інстытуту перадала справу аб Яцэнтоўскім у пракуратуру.

17 лістапада 1928 году старшы сьледчы Менскай акругі т. Страценка прыходзіць да выводу, **„што ў дзейнасьці Яцэнтоўскага, як загадчыка станцыі аховы расьлін, сьледзтвам устаноўлена нядбайнасьць адносна ашчады рэчаў станцыі, якая выказалася ў непрыняцьці належных мер да іх аховы, што ляжала на яго службовых абавязках".**

За вывадамі ідзе пастанова:

„На падставе п. 5 арт. 4 і арт. 203 КПК гэтую справу накіраваць праз пракурора ў Менскі акруговы суд на спыненьне і для дальейшага накіраваньня справы ў Беларускі Навукова-Дасьледчы інстытут імя У. І. Леніна для разгледжаньня ў дысцыплінарным парадку.

Ст. Сьледчы Менскай акругі Сіраценка".

Справай станцыі аховы расьлін па даручэньню старшыні СНК т. Галадзеда займалася таксама і рабоча-сялянская інспэкцыя. Выходзячы з вынікаў абсьледваньня, калегія НК РСІ на пасяджэньні **10 студзеня 1929 году** выносіць пастанову паставіць на від дырэкцыі НДІ, а ў адносінах безгаспадарчасьці, страты маёмасьці станцыі і скарыстаньня апошняй у вузка ўласных інтарэсах былым кіраўніком станцыі—перадаць справу пракурору для вытварэньня спэцыяльнага сьледзтва і прыцягненьня да судовай адказнасьці.

У гэты-ж час у судовых органах і органах пракуратуры распачалася самая звычайная валакіта.

З 17 лістапада 28 да 1 лютага 1929 г. справа Яцэнтоўскага валялася невядома дзе і толькі 1 лютага на распарадчым пасяджэньні крымінальнага аддзелу Менскага акруговага суду разглядаецца справа і выносіцца пастанова:

„З пастановай ст. сьледчага згадзіцца і за адсутнасьцю ў дзеяньні Яцэнтноўскага складу крымінальнага злачынства справу на падставе арт. 4 п. 5 КПК вытворам спыніць і абраную меру прасячэньня падпіску аб неадлучцы адмяніць Дысцыплінарнага прасьледваньня супроць Яцэнтоўскага ня ўзбуждаць за сілай амністыі ў адзнаку 10 гадавіны існаваньня БССР".

Па прапанове-ж калегіі НК РСІ ад 10 студзеня кладзецца рэзалюцыя:

„Даручыць прак. Менск. акр.
Гохман, 28-I—29 г.".

Амаль месяц у Менскай пракуратуры валяецца прапанова т. Гохмана, толькі 23 лютага ў пам. акр. пракурора Зысьмана загаварыла сумленьне і ён піша:

„У пракуратуру Рэспублікі.

Паведамляецца, што справа па абв. Яцэнтноўскага сьледзтвам скончана ст. сьледчым Менакругі і 20 лістапада 28 г. накіравана ў Менакроуд на спыненьне і далейшага накіраваньня ў НДІнст. для разгледжаньня ў дысцыплінарным парадку.

Нам. акр. пракурора Зысьман."

А як-жа, т. Зысьман, з пастановай акруговага суду,—ці яна вам невядома? А як-жа з пастановай калегіі НК РСІ? Ці гэта вас не датычыцца?

Але ідзем далей. 2 сакавіка з Наркамюсту пішуць у акрпракуратуру:

„... Ваша паведамленьне ад 23-II--29 г. датычыцца справы па абв. Яцэнтноўскага, скончанай сьледчым 20-XI--28 г. і значыцца не зьяўляецца адказам на нашу прапанову ад 28-I—29 г.

Пракуратура Рэспублікі просіць паведаміць, ці праведзена сьледзтва па матар'ялах РСІ І, калі скончана, вынікі яго".

Зноў больш месяца раскачваўся тав. Зысьман і толькі 11 красавіка піша адказ:

„У пракуратуру Рэспублікі.
Копія НК РСІ.

Паведамляецца, што пастанова РСІ ад 10 студзеня 29 г. адносіцца да справы па абв. прафэсара Яцэнтоўскага ў нядбайнасьці да ашчады маемасьці станцыі аховы расьлін, па якой справе і вытварана сьледзтва".

Далей паважаны бюракрат ад пракуратуры паведамляе, што справа была накіравана на спыненьне і Менскім акрсудом спынена.

Што далей? Далей у органах пракуратуры забыліся аб гэтай справе, забыліся нават аб пастанове калегіі НК РСІ. Так магчыма яно і прайшло-б усё „тихо и гладко", але не забылі пра гэту справу ў НК РСІ, і ў выніку—яна ва ўсім яе комплексе будзе ў бліжэйшыя дні разглядацца на калегіі НК РСІ.

З свайго боку мы патрабуем перагляду справы былога дырэктара станцыі па ахове расьлін проф. Яцэнкоўскага, патрабуем таксама прыцягненьня да адказнасьці працаўнікоў Менскай акрпракуратуры за агідную валакіту і бюракратычнае вырашэньне справы „вучонага мужа", а таксама за ігнараваньне пастановы Калегіі НК РСІ.

В. Зайцаў.

„Нябожчыкі ў спачуваньні ня маюць патрэбы".

(НІБЫ ФЭЛЬЕТОН).

Жыў ва сьвеце адзін дзівак, па прозвішчы Валаводзін. І ён лічыўся красамоўцам. Бывала, калі ўвойдзе ў газард, без малога 6 гадзін сыпле. Слухаючы Валаводзіна ў парадку саюзнай дысцыпліны, нехта, хаўкнуўшы тройчы, пераўнаў красномаўцу з талентам Троцкага і, абапіраючыся на сьпінку крэсла, прасіў суседа, каб той разбудзіў яго ў бягучых справах—для вырашэньня дробных пытаньняў.

Арыгінальны быў чалавек. «Нажаль», РСІ аднаго разу прыбрала Валаводзіна да сваіх рук і кудысьці справадзіла. З тэй пары нашы фэльетаністы згубілі з Валаводзкім усялякую жывую і мёртвую сувязь. Але-ж ня ў гэтым яшчэ справа. Справа вось у чым:

1-га жніўня 1928 году чырвонаармеец роты сувязі № корпусу Бабіцкі, маючы на сваім утрыманьні інвалідабацьку і непрацаздольных сястру з маткаю, узьняў хадайніцтва перад Гомельскім гарсаветам аб выдачы яго сям'і дапамогі. Сваё маемаснае і сямейнае становішча Бабіцкі належна надмацваў адпаведнымі дакумэнтамі. Аднак, 27 жніўня 1928 году Гомельскі Гарсавет, чамусьці абапіраючыся на адсутнасьць у Бабіцкага дакумэнтаў, якія далі-б права на льготу, у выдачы дапамогі адмовіў. Даведаўшыся, што Гарсавет парушыў законныя правы на атрыманьне дапамогі, чырвонаармеец Бабіцкі падаў скаргу вайсковаму пракурору.

Нарэшце, справа трапляе да Гомельскага акрпракурора, які, заплючыўшы вочы, „супакоіў" чырвонаармейца тым, што прызнаў пастанову Гарсавету аб адмове ў дапамозе правільнай. Вайсковы пракурор зьвярнуўся з пратэстам да пракурора рэспублікі (няўжо-ж гэта ў парадку спаборніцтва?). Там, магчыма, інакш паглядзелі на гэтую справу, бо ўжо ў сярэдніх лічбах ліпеня 1929 г. той-жа Гомельскі Гарсавет, разглядаючы тыя-ж самыя дакумэнты, пастанавіў дапамогу выдаваць, але-ж... і вось у гэтым «але-ж» Гарсаветчыкі, раптоўна бачыце, пастанавілі выдаваць дапамогу ня з дню ўзьняцьця хадайніцтва, а з дню пастановы, ведаючы аб тым, што чырвонаармеец Бабіцкі праз 2-3 дні дэмабілізуецца, а сам аб'ект дапамогі—стары Бабіцкі яксьці памёр. Калі паміраў стары Бабіцкі, дык у «заключным слове» аўтарытэтна заявіў: Паўзеце вы галопчыкам, браткі мае Гомельчане з гарсавету, да д'ябла! Нябожчыкі ў спачуваньні ня маюць патрэбы. Усліся вы мне досыць у косьці і так без дапамогі, валаводзіцца два гады, хутчэй дачакаўся сьмерці, чымся дапамогі.

Зараз дэмілізаваны чырвонаармеец Бабіцкі пытаецца аб тым, хто адкажа за 2-хгадовую валакіту і зьдзекі над чырвонаармейцам. Далучаючыся да Бабіцкага мы дадаем „маленькае" запытаньне Гомельскаму акрпракурору:—ці не кіраваўся пракурор законам, „што дышлам", калі санкцыянаваў правільнасьць пастановы Гарсавету аб адмаўленьні ў дапамозе чырвонаармейцу і што гэта былі за законы, калі мог падкапаца вайсковы пракурор? Што-ж датычыцца сучасных клапот, якія праяўлены з боку Гарсавету да старога Бабіцкага, дык, выбачайце: „нябожчыкі ў спачуваньні патрэбы ня маюць".

Якуб Паляшчук.

Калгас імя газэты „Савецкая Беларусь" у „Дзень ураджаю і калектывізацыі".

Крыху гісторыі.

Чатырнаццаць год гарочыцкія беднякі цягнулі лямку сталіпінска-хутарскога жыцьця, чатырнаццаць год цягалі жанчыны-бядначкі калыскі за плячыма за 5-10 вёрст на хутары, а ў 1929 годзе сказалі:—даволі, апошні год і больш ня будзем!

Адмовіліся і арганізавалі калгас імя газэты «Савецкая Беларусь».

Калгасьнікі паслалі газэце запэўненьне, што яны будуць цьвёрдыя і пачатую імі справу давядуць да канца—калгас будзе і будзе прыкладным.

Газэта «Савецкая Беларусь» адгукнулася, узяла шэфства над калгасам, выехала ў вёску з друкарскай машынай і дапамагла арганізацыйна аформіць калгас.

Зіму калгасьнікі скарысталі на афармленьне і падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Пачынаецца калектыўная творчая праца.

Як толькі пачаў таяць сьнег, калгасьнікі пачалі зносіць у адно месца прылады для апрацоўкі зямлі. Сьнег растаяў—і ў калгасьнікаў былі адрамонтаваны збруя і сельска-гаспадарчыя машыны. Дзесяць калгасьнікаў мелі 6 коняй, 8 камплектаў збруі, сем вазоў, чатыры касякі-плугі і іншы інвэнтар. Калі-б карысталіся па аднаму, то ў кожнага не хапала-б, а калі аб'яднаці, то адразу змаглі запрагчы ўсе 6 коняй.

Зямлі калгасьнікі абагуленай ня мелі, і першую вясну прышлося сеяць калектыўна на асабістых хутарох калгасьнікаў і абагуленым насеньнем. З хутару на хутар пераяжджалі калгасьнікі адзін за другім абсяваючы.

Цяжкавата было: мала і слабая рабочая жывёла, прышлося купіць аднаго каня, і закончылі лягчой.

Вясна яшчэ цяжкая была і таму, што ў калгас уступілі беднякі і амаль у кожнага не хапала хлеба, не гаворачы ўжо аб насеньні. Дружная праца калгасьнікаў і жаданьне даказаць, што бясплах здольны набудаваць дорую гаспадарку, перамаглі ўсе цяжкасьці і перашкоды.

Яшчэ не закончылі калгасьнікі веснавой сяўбы, як прыехалі каморнікі праводзіць земляўпарадкаваньне. Колькі радасьці было ў калгасьнікаў у той час, калі першы раз вышаў каморнік у поле!

Болей месяца працаваў каморнік, і больш сто рабочых дзён аддалі калгасьнікі на земляўпарадкаваньне калгасу, але крыўды чутно ня было, бо кожны ведаў, што сёньня пагарую, дык заўтра будзе лепш.

Закончылі земляўпарадкаваньне і заняраз-жа прыступілі да перавозкі будынкаў сяброў калгасу з хутароў на сядзібу калгасу, а тут касавіца падышла. У гэты час, каб ня даць спазьніцца з уборкаю сена і хлеба, калгасьнікі рашылі адмовіцца ад дзён адпачынку.

— Лепш узімку адпачнем, а цяпер, брат, працуй і напраўляйся—кажуць калгасьнікі, і паўтара месяцы ня было ніводнага дню адпачынку.

Хаты вазілі і складалі ўрыўкамі ў дождж і за лета адбудавалі кватэры чатыром сем'ям. Гэта ня многа, але калгасу пры 10 сем'ях—гэта вялікае дасягненьне.

Для асеньняй сяўбы калгас ужо меў абагуленую зямлю, і трэба было яшчэ раз панатужыцца, каб пашырыць азімы клін. Акркалгассаюз намеціў па пляну засеяць жытам 15 га, што перавышала-б мінулагоднюю плошчу жыта на 50 пр., а калгасьнікі сказалі: — Не, брат, калі мы будзем так памалу расьці, дык з нас і куры будуць сьмяяцца; мы павінны ў наступным годзе ўжо часткова заплаціць хлебам дзяржаве за тую дапамогу, якую яна нам аказала ў гэтым годзе. Менш 25га і ня думаем.

Яшчэ ня было выпадку, каб калгасьнікі „Савецкай Беларусі" сказалі і ня выканалі; так і тут: раз сказалі, дык узяліся і замест 25 засеялі жытам 30 га.

СЬЦЯГ КАЛГАСУ І ШКОЛЫ, АТРЫМАНЫЯ АД РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

Становішча калгасу ў „Дзень ураджаю і калектывізацыі".

Усе калгасьнікі маюць, хоць невялікія, але кожны для сваей сям'і каватэры ў дамох, пабудаваных на сядзібе калгасу, якія лічацца маемасьцю не асобных гаспадароў, а ўсяго калгасу.

Замест 6 ключ калгас мае 10 штук добрых рабочых коняй, замест 16 кароў—17; калгас мае сваю конную з прывадам малатарню, дыскавую дзесяцірадковую сеялку, культыватар, чатыры новыя параконныя плугі і 4 старых аднаконных, вагу на 250 кілёграмаў, і шмат іншага дробнага інвэнтару, набытага калгасам. Усе палявыя работы ў калгасе закончаны, за выключэньнем зяблевага араньня.

Зараз калгас прыступае да адбудовы агульнай аборы даўжынёю ў 60 аршын і шырынёю ў 14 аршын.

КАЛГАСЬНІКІ З МУЗЫКОЙ ЕДУЦЬ НА ВЫСТАЎКУ

Кулакі і падкулачнікі, якія спачатку даказвалі, што з калгасу нічога ня будзе, бо ў калгас сабраліся ўсе гультаі і лодыры, зараз гэтага ня кажуць, а ўзялі сабе другі кірунак і ўжо даказваюць, што ў калгасе прыходзіцца працаваць як на паншчыне; але і гэтыя довады разьбіваюцца, бо яшчэ ўлетку праўленьне калгасу настайвала, каб дні адпачынку былі, але не хацелі адпачываць самі калгасьнікі. Стаўка кулака і на гэтым месцы біта.

Кулак губляе пад сабою глебу, а калгас з кожным днём расьце, ня словам, а працай і посьпехамі даказываючы выгады калгаснага жыцьця.

У першым годзе свайго жыцьця калгас вырасьціў капусту па $18^1/_2$ ф. качан і на выстаўцы ў Дамановічах атрымаў першую прэмію—барану зіг-заг. Калі сеялі гэтую капусту, то некаторыя сяляне казалі:—Пабачым, ці нарасьце ў вас тут капуста пры вашай навуковай эпрацоўцы зямлі. Аж яна як на зло парасла такая, якой няма ва ўсёй вёсцы і нават на выстаўцы была першай.

Дапамога шэфа калгасу.

Як толькі арганізаваўся калгас і назваў сябе імем газэты «Савецкая Беларусь», апошняя ўвесь час дапамагала калгасу. За час існаваньня калгасу шэф зрабіў чатыры выезды ў калгас. Усё гэта падымала дух калгасьнікаў, і трэба сказаць, што кожны выезд даваў штуршок у працы калгасу.

У «Дзень ураджаю і калектывізацыі» газэта «Савецкая Беларусь» падаравала праз адказнага рэдактара газэты тав. Шастакова падшэфнаму калгасу чырвоны сьцяг з баявым лёзунгам—„За калектывізацыю вёскі".

Перадаючы сьцяг, тав. Шастакоў спыніўся на тых задачах, якія стаяць у сучасны момант перад беднатой і калгасамі ў сэнсе перабудовы вёскі на новы лад, у сэнсе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Прымаючы сьцяг, калгасьнік Драздоў запэўніў шэфа, што задачы, пастаўленыя перад калгасамі партыяй і савецкай уладай будуць калгасам «Савецкая Беларусь» выкананы, што калгас будзе так працаваць, каб праз год вёска Гарочыцы стала ўся буйным калгасам.

У часе перадачы чырвонага сьцягу калгасьнікі ўнесьлі прапанову абраць адказнага рэдактара газэты «Савецкая Беларусь»—члена ЦВК БССР т. Шастакова ганаровым сябрам калгасу імя газэты „Савецкая Беларусь". Прапанова была прынята аднагалосна пад бурныя воплескі як сяброў калгасу, так і прысутных сялян, яшчэ не аб'яднаных у калгас.

Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь" падаравала чырвоны сьцяг і Гарочыцкай чатырохгадовай працоўнай школе.

Прымаючы чырвоны сьцяг, загадчык школы т. Лявонік запэўніў рэдакцыю „Савецкай Беларусі", што Гарочыцкая школа прыкладзе максымум стараньня, каб тыя задачы, якія пастаўлены перад школай, выканаць поўнасьцю. Чырвоны сьцяг будзе штодня напамінаць словы, выказаныя ў часе перадачы сьцягу адказным рэдактарам газэты „Савецкая Беларусь" членам ЦВК БССР т. Шастаковым, і школа будзе іх выконваць.

НА ВЫСТАЎЦЫ

Агульны сход заслухаў справаздачу праўленьня аб становішчы працы і посьпехах калгасу за лета і ў сваёй пастанове даў шэраг указаньняў, што трэба зрабіць у далейшым.

Галоўнымі з дадзеных дырэктыў вьяўляюцца: пашырэньне калгасу і ўзбуйненьне яго за лік беднаты і серадняку, арганізацыя лікпункту і 100-процантная ліквідацыя няпісьменнасьці, арганізацыя і сталае правядзеньне культурна - масавай працы павялічэньне ўраджайнасьці і цэлы шэраг іншых.

Выслухаўшы справаздачу, калгасьнікі суседняга калгасу „Чырвоны Сьцяг" унесьлі прапанову аб'яднаць калгасы „Савецкая Беларусь" і «Чырвоны Сьцяг» у адзін буйны калгас. Прапанова прынята аднагалосна.

Таксама ўнесена прапанова вышэйпамянёнымі калгасамі назваць Дамановіцкі куст сельска-гаспадарчых калгасаў імем газэты „Савецкая Беларусь", бо калгасы, аб'яднаемыя ў куст, арганізаваліся пры дапамозе рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь". Прапанова прынята аднагалосна.

Пасьля зачыненьня сходу сіламі Гарочыцкага драмгуртка была пастаўлена п'еса „Гапка" Галубка.

Вас. Дубовы.

ДА ЎСІХ РАБКОРАЎ І СЕЛЬКОРАЎ.

Адкрыты ліст.

ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ!

У хуткім часе камісія НК РСІ прыступае да абсьледваньня і праверкі працы суду і пракуратуры адносна ажыцьцяўленьня імі рэвалюцыйнай законнасьці і правядзеньня клясавай лініі ў практычнай працы.

Абсьледваньне ставіць мэтай высьвятленьне недахопаў, якія маюць месца, палепшаньне працы органаў юстыцыі, садзейнічаньне праверцы і чыстцы асабовага складу гэтага апарату.

Гэта важная і адказная праца дасьць добрыя вынікі тады, калі ў ёй будуць прымаць удзел шырокія масы працоўных.

Судова-сьледчы апарат зьяўляецца адным з органаў дзяржаўнага апарату, які павінен стаць на варце пралетарскай дыктатуры, пільна сачыць за клясавым ворагам, абараняць рэвалюцыйную законнасьць. Таму рабочая класа і працоўнае сялянства павінны быць зацікаўлены, каб гэты апарат адпавядаў пастаўленым перад ім задачам.

Дапамагаючы праверцы і чыстцы, мы гым самым дапамагаем яго ўзмацненьню.

Асаблівую ролю ў гэтай працы павінны адыграць нашы рабкоры і селькоры. Мы заклікам гэту армію актыву—расяданых па ўсіх кутках БССР—нашых рабселькораў прыняць шчыры ўдзел, дапамагчы органам РСІ ў ажыцьцяўленьні гэтай задачы. Адбіваючы грамадзкую думку вакол гэтага пытаньня на старонках газэты, вы сваімі допісамі дапаможаце вырашэньню задач, якія стаяць перад РСІ.

Лёзунгі самакрытыкі павінны быць разгорнуты ва ўсю шырыню ў практычным праламленьні.

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь" чакае ад вас допісаў, поўных і яскравых момантаў грамадзкай думкі адносна высунутага пытаньня.

Пішэце, наколькі суд і пракуратура ваду барацьбу з бюракратызмам, цеганінай, безгаспадарчасьцю і іншымі злачынствамі, якія выкрыўляюць дырэктывы партыі і ўраду. Якая роля суду і пракуратуры ў сэнсе палепшаньня якасьці працы дзяржаўнага і кааперацыйнага апарату ў адпавednасьці з пастановамі XV зьезду УсеКП(б). Наколькі карная палітыка суду і пракуратуры адпавядае клясавай лініі, наколькі сцяны органы хутка рэагуюць на вылазкі клясавага ворага і наогул на злачынствы, накіраваныя супроць дзяржавы і рэвалюцыйнай законнасьці.

Вось галоўныя пытаньні, якія павінны прыцягнуць да сябе грамадзкую думку і падпасьці пад агонь самакрытыкі.

РЭДАКЦЫЯ.

ХРОНІКА

У Доме Пісьменьніка.

19 кастрычніка адбылося спатканьне беларускіх пісьменьнікаў з Тэатрам Рабочай Моладзі.

Якуб Колас, вітаючы Тэатр Рабочай Моладзі ад імя праўленьня Дому Пісьменьніка, зазначыў, што роля пісьменьніка ў сучаснай грамадзе быць ня толькі вузкім прафэсыяналам, але і грамадзкім дзеячом, які павінен стаць блізка да самай грамады, зьліцца з ёю, каб адтуль чэрпаць асноўныя матывы для сваёй творчасьці і аддаваць іх ператоранымі ў мастацкія вобразы зноў грамадзе.

Аб творчых шляхох беларускай літаратуры вельмі грунтоўны даклад прачытаў праф. Піотуховіч, які вызначыў асноўныя этапы разьвіцця беларускай літаратуры ў сувязі з разьвіцьцём эканамічных форм.

Сьцісла падышоўшы да сучаснага стану беларускай літаратуры, ён вызначыў тыя шляхі, якімі павінна пайсьці яна ў далейшым.

Літаратура павінна адбіць і паказаць у мастацкіх вобразах працу, быт, ролю ў барацьбе за новыя формы жыцьця, ідэалёгію і жыхалёгію рабочае клясы сучаснага і мінулага.

З гэтага пункту гледжаньня былі прааналізаваны тыя літаратурныя згуртаваньні, якія існуюць зараз у Беларусі, з адпавednай ацэнкай іх творчай дамінанты.

З боку тэатру выступіў рэжысэр Тэатру Рабочай Моладзі т. Гурскі, які высьветліў галоўныя моманты з разьвіцця тэатру, вызначыў тыя задачы, якія стаяць перад сабою тэатр.

Тэатр Рабочай Моладзі—гэта новае ў галіне тэатральнага мастацтва. Ён шукае новыя формы, новую тэматыку і пракладае тут новыя шляхі.

Вобразы, якія паказвае тэатр, узяты з жыцьця рабочага, і выканаўца іх таксама рабочы.

ТРАМ чакае вялікая і слаўная будучыня.

Пасьля афіцыяльнай часткі артыстамі і пісьменьнікамі былі наладжаны гульні і скокі.

Вечар спатканьня прайшоў бадзёра, жвава і весела. Хоць гэта было і першае спатканьне, але адчувалася таварыская блізкасьць, агульная задаволенасьць спатканьнем.

Трэба больш такіх спатканьняў. Яны знаёмяць нашу рабочую моладзь з пісьменьніцкім калектывам, а пісьменьнікаў уцягваюць у самую гушчу рабочай моладзі і рабочых З.

СУД.

ШАЙКА БАНДЫТАЎ.

Алесь Міхасёў Жукоўскі ў 1926 г. кінуў службу на чыгунцы і пашоў па шляху злачынстваў. У 1928 г. па пастанове Дзяржаўнай Палітычнай Управы Жукоўскі, як сацыяльна небясьпечны, быў высланы на тры гады ў Вяцкую акругу.

Не адбыўшы пакараньня, у сакавіку 1929 г. Жукоўскі вярнуўся ў Менск да свайго сябра Вольскага Стася, з якім пачалі арганізоўваць банду. Хутка да іх далучыўся Уладзімер Віткоўскі.

8 сакавіка г. г. увечары Жукоўскі, Вольскі і Віткоўскі ўзброіўшыся рэвальвэрамі, прышлі ў пасёлак Каладзішчы, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, дзе зрабілі напад на дом гр. Мордуха Гурэвіча. Бандыты сталі пагражаць зброяй, апроч таго, схапілі за горла дачку Гурэвіча Шэйну і пачалі душыць. У выніку—бандыты абрабавалі ў Гурэвіча 400 р.

19 сакавіка г. г. Жукоўскі і Вольскі ў г. Менску зрабілі напад на дом гр. Біцэнскага (па Койданаўскаму тракту), дзе таксама абрабавалі 500 руб.

Пасьля гэтых рабункаў Жукоўскі пачаў пашырэць банду. Па яго ініцыятыве ў банду былі ўцягнуты Крыўчык Васіль і браты—Мікалай і Алесь Маўчанскія.

4 красавіка г. г. увечары на кватэры Маўчанскіх быў распрацаваны плян дзейнасьці банды і тады-ж былі ўзброены рэвальвэрамі Краўчык і Маўчанскія. Праз некалькі дзён бандыты, надзеўшы маскі, зрабілі напады на дамы гр. г. Менску—Сьлісаля, Любецкага і Пінхасіка, дзе пры аказаньні Пінхасікам супраціўленьня нанесьлі Пінхасіку цяжкія раненьні, але абрабаваць Пінхасіка, Любецкага і Сьліселя бандытам не ўдалося, бо на крык зьбегліся суседзі, і бандыты, скінуўшы маскі, уцяклі.

Калі распачалося сьледзтва, хутка бандыты былі затрыманы, прычым у кватэры іх былі знойдзены абрабаваныя рэчы і грошы.

На судовым сьледзтве правадыр банды Жукоўскі ў злачынствах прызнаўся.

Пасьля двухдзённага разбору справы Менскі акруговы суд пад старшынствам Грамыкі прыгаварыў: Алеся Міхасёвага Жукоўскага да вышэйшай меры сацыяльнай абароны — на расстрэл, Стася Вольскага—на дзесяць год, Міколу Маўчанскага—на восем год, Уладзімера Віткоўскага—на шэсьць год, Алеся Маўчанскага і Васіля Крыўчыка—на чатыры гады зьняволеньня.—Усіх з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на тры гады кожнага.

Па адбыцьці пакараньня Маўчанскаму Міколе і Вольскаму забаронена праживаць у Менскай і Полацкай акругах.

Вярхоўны суд БССР цалкам зацьвердзіў прысуд і скаргі асуджаных адхіліў.

Прыгавар адносна Жукоўскага выкананы. Р. К.

ШТО СЛУХАЦЬ ПА РАДЫЁ

Аўторак, 22 кастрычніка.

17-00—Час піанэра і вучня.
17-30—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт—лекцыя па прамыслова-тэхнічнаму факультэту і ф-ту калектывізацыі.
18-30—Палітычныя перадачы—аб камісіях РСІ, пры РВК і с.-саветах.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўр. аддзелам).
20-00—Паверка часу.
20-00—Радыёматар.
20-00—Сялянская вячорка.
21-00—Навуковая лекцыя—тэхніка масам.
22-00—Трансляцыя савецкіх і замежных станцый.

Серада, 23 кастрычніка.

17-00—Сялянская радыё-газэта (з яўрэйскім аддзелам).
17-40—Пасьляабедзенны канцэрт (опэрн. арыі, урыўкі і нар. музыка).
18-30—Беларускі батрак.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з польск. аддзелам).
20-00—Паверка часу.
20-20—Рабоча-сялянскі Радыё-Унівэрсытэт—лекцыя па матэматыцы і прыродазнаўству.
21-00—Комсамольскія перадачы.
21-00—Гістарычны канцэрт.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

Пачынаецца чыстка ячэйкі НКА.

Сёньня, 22-га кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары ў клюбе „Чырвоны Дрэваапрацоўшчык" (Савецкая, 125) пачынаецца чыстка ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы.

На сход запрашаюцца рабочыя і работніцы заводу „Дрэваапрацоўшчык".

Просьба да рабочых іншых прадпрыёмстваў і ўсіх асьветнікаў зьявіцца на чыстку ячэйкі НК Асьветы.

БЮРО ЯЧЭЙКІ.

Апавяшчэньні.

У сераду 23-10—Юнсэкцыя Дому наладжвае дыспут на тэму:

„Пралетарская літаратура ў Беларусі", з уступным словам выступіць загадчык АПАД ЦК КПБ т. СЯНЬКЕВІЧ.

У якасьці апонэнтаў выступяць праф. Вальфсон, праф. Ігнатоўсні, праф. Барычэйскі, праф. Піотуховіч, дац. Бухаркін, т. Бабарэка, т. Галавач, т. Канаплін, т. Аляхновіч і інш. таварышы, а таксама прадстаўнікі літаратурных аб'яднаньняў БелАПП, „ПОЛЫМЯ" і „УЗВЫШША".

Білеты ў канцэлярыі дому.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Гурток фізкультуры будзе займацца па серадах і суботах у школе № 1 муж. група ад 9—10 гадзін, жаночая група ад 10-11 гадз. першыя заняткі ў сераду 23 кастрычніка.

24 кастр. а 8 гадзіне заняткі палітнурсаў і гурткоў.

Паштовая скрынка.

А. Л. Артыкул „Спаборніцтва школ за ўраджайнасьць" нічога канкрэтнага не дае. Друкаваць ня будзем.

А. Білееву. Коханава. Пішыце, што кая крэтна зроблена ў вашым раёне па галіне антырэлігійнай працы ў апошні час.

М. Заонічу.—Апавяданьне „На ўздагон жыцьцю" пераслалі ў БелАПП.

— Вершы—„Ну, дык, пакуль" і „Межскі"—слаба напісаны, друкавацца ня будуць.

І. Шпаку.—Апавяданьне „Час усё зробіць" надрукавана ня будзе: галоўны момант у ім—развод паказан штучна; у апавяданьні залішне „эротычных" перажываньняў, ненатуральнай мляцасьці.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Безгаспадарчасьць у дзіцячай калёніі „Серп і Молат".

Патрэбна аздараўленьне кіраўніцтва калёніяй.

З матар'ялаў абсьледаваньня дзіцячай калёніі „Серп і Молат" (Заслаўскі раён, Меншчына) відаць, што з прычыны кепскага кіраўніцтва ўся праца калёніі прышла да поўнага заняпаду.

— Загадчык калёніі Васкабовіч вёў працу бяссыстэмна і бясплянава. Ня гледзячы на тое, што гаспадарка калёніі прыняла жывёлагадоўчы ўхіл, сьвінагадоўля амаль спынілася: лік жывёлы ў калёніі наогул за апошні час паменшыўся.

Сёлета значна зьнізіўся ўраджай жыта. Замест 3 тысяч пуд. ураджаю ў мінулым годзе сёлета сабрана толькі каля 1000 пуд.

Апрацоўваюць палі самі вучні, але бяз усякага нагляду. Віка ў мінулым годзе зусім згніла—у полі ўраджай жыта мінулага году быў абмалочан толькі ў чэрвені бягучага году.

Абсьледаваньнем устаноўлена, што ў калёніі пуставалі 4 гэктары зямлі, частка гароду таксама ня была выкарыстана.

Асабліва ў дрэнным становішчы знаходзяцца будынкі калёніі. Дахі на іх старыя, дзіравыя. Збожжа і сена гніе. Загадчык калёніі нават не падумаў аб тым, каб своечасова падрыхтаваць будаўнічы матар'ял. У выніку—пагроза, што будынкі наогул ня будуць адрамантаваны.

Уся сядзіба калёніі знаходзіцца ў антысанітарным становішчы.

Устаноўлена, што ў часе пасяўной кампаніі загадчыку гаспадаркай быў дадзен чарговы воднуск, а сам загадчык калёніі Васкабовіч быў у ад'езьдзе.

Сярод дзяцей наглядаецца поўная адсутнасьць дысцыпліны і дэзарганізацыя. Дзяцей прымушалі працаваць па 8 гадзін у дзень, прычым за 4 гадзіны дзецям плацілі грашыма. Выхаванцы калёніі за гэтыя грошы куплялі папіросы, наладжвалі папойкі і г. д.

Навучальны год, з прычыны нядбайнасьці кіраўнікоў, сёлета пачаўся з вялікім спазненьнем.

Траба адзначыць, што акруговы інспэктарыят ня прыняў своечасова захадаў да зьнішчэня ўсіх гэтых недахопаў.

Увесь матар'ял аб злоўжываньнях у калёніі „Серп і Молат" перадаецца прокуратуры для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Рабселькоры нам пішуць.

„ТРЮКІ" ДОКТАРА БЫЛІНСКАГА.

Доктар Былінскі ў Калінкавіцкай больніцы зрабіў апэрацыю жонцы б. нач. міліцыі Шоркавай. Калі прышлі санітаркі з насілкамі ўзяць хворую, каб перанесьці яе ў другі пакой, доктар Былінскі сказаў так: „Нясьці яе ня трэба, хай сама ідзе. Яе насілі, як была жонкай начальніка міліцыі, а цяпер—невялікая шышка".

Кабета прымушана была ісьці сама, але не зрабіла і двох крокаў, як зараз-жа самлела.

Выпадкаў гэткага „далікатнага" абыходжаньня з хворымі на сумленьні доктара Былінскага шмат. Вока.

ЗРЫВАЮЦЬ СПРАВУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

У 1928 годзе пры земляўпарадкаваньні вёскі Сьметанка, Копыскага раёну, Аршанскай акругі, беднякі гэтае вёскі падалі заяву, што яны ўступаюць у калектыў. Каморнік „зьліквідаваўся" над імі і адрэзаў самы горшы кавалак зямлі. Капыскі і Аршанскі зямельныя аддзелы не зьвярнулі на гэта аніякае ўвагі. Наркамзем БССР абяцаў выслаць камісію дзеля рассьледаваньня, але да гэтага часу ніхто не прыяжджае. А кулакі сьмяюцца.

Петрушкін, Шыдлоўскі.

Тав. Чарвякоў вярнуўся з водпуску.

Старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў А. Г. зьвярнуўся з Масквы з водпуску і прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў.

За несваечасовую прысылку зьвестак аб загатоўках абвешчана вымова.

За сыстэматычнае спазьненьне і непрадастаўленьне апэрацыйных зьвестак аб загатоўках, Менскім аддзяленьнем Белкаапсаюзу абвешчана вымова наступным старшыням і праўленьням спажывецкіх кааперацый: Навадворскаму с.-т., Карсакавіцкаму, Ленінскаму, Вілейскаму, Раванічскаму с.-т., Апалінскаму і Вобчанскаму.

Слаба растлумачваецца значэньне бесперапыннага рабочага тыдню.

Прэзыдыум ЦП саюзу транспартнікаў заслухаў інфармацыі аб ходзе работ па пераводу на бесперапынны працоўны тыдзень. Як відаць з матар'ялаў, праца па пераводу вядзецца недастаткова, слаба растлумачваецца рабочым значэньне бесперапыннага тыдню.

Усім мясцовым організацыям дадзены адпаведныя дырэктывы.

Трактарная калёна імя „Беларускага пралетарыяту".

У адказ на заклік Іванава-вазьнясенскіх тэкстыльшчыкаў ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў пастанавіла пачаць збор сродкаў на пабудову трактарнай калёны імя „Пралетарыяту Беларусі". Усім ФЗМК накіраван дырэктыўны ліст па гэтаму пытаньню. Члены прэзыдыуму саюзу першыя адлічылі аднадзённы заработак на пабудову калёны.

Тэхнічныя курсы для рабочай моладзі.

Дзеля ўзьняцьця тэхнічных ведаў рабочай моладзі на фабрыках „Дняпроўская Мануфактура" і „Дзьвіна" адчыняюцца тэхнічныя курсы.

Акрамя таго, на гэтых-жа прадпрыемствах адчыняюцца спэцыяльныя курсы для ўзьняцьця тэхнічных ведаў дарослых рабочых.

Кватэры рабочым.

На кватэрнае будаўніцтва для рабочых дрэваапрацоўшчыкаў на 1929-30 год. прадугледжана 100 тысяч рублёў. Будаўніцтва ў першую чаргу ахопіць заводы і фабрыкі Бабруйску, Рэчыцы.

Клюб для рабочых бубруйскага камбінату.

У сувязі з тым, што на бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце колькасьць рабочых павялічваецца да 1500 чал., саюз узьняў пытаньне аб пабудове каля камбінату ў бягучым гаспадарчым годзе клюбу для рабочых.

У дапамогу вёсцы.

Ярцаўскія рабочыя выклікалі фабком ф-кі „К. Маркса" на спаборніцтва па паленшаньні працы на вёсцы.

Шэфскія арганізацыі заводу арганізавалі у 3 вёсках лікпункты, правялі шэраг сходаў па розных пытаньнях бягучай палітыкі. Ф-ка, акрамя таго, узяла шэфства над калгасам.

У фонд індустрыялізацыі.

11 і 12 кастрычніка вучні 29 Менскай савецкай сямігадовай школы разам з настаўнікамі наладзілі нядзельнік на карысьць індустрыялізацыі. Вучні і настаўнікі сабралі, абцерабілі і вывезьлі буракі з 2,3 га. За гэтую працу школа ў савгасе Лашыца адтрымала 100 рублёў, грошы будуць здадзены у фонд індустрыялізацыі.

Удзельнік.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 22 КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.96,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.	130.
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.45	100.85
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.46	25,56
3-ясялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.02,5	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10. 76
2 выйг. паз. індустр. 27 г.	25,27	25. 37
1 „ „ „ проц.	25.39,5	25.49,5
2 „ „ „ 6-проц.	25.39,5	25.49,5
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.56	101.61
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.64	—

ДА ЎВАГІ ЎСІХ БІБЛІЯТЭК

На падставе пастановы прызыдыуму ЦСПСБ З КАСТРЫЧНІКА 1929 г. АРГАНІЗАВАЎСЯ

АБ'ЯДНАНЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ (КНІЖНЫ) КАЛЕКТАР

(Менск, Дом Працы, 2-гі паверх, тэл. № 6-37).

КАЛЕКТАР бярэ на сябе нармальнае забесьпячэньне бібліятэк рэкамэндацыйнай літаратурай усіх выдавецтваў і камплектаваньне ўсякіх бібліятэк на беларускай, расейскай, яўрэйскай, польскай і інш. мовах.

КАЛЕКТАР па жаданьні бібліятэк дае ім кнігі ў аправе і поўнай бібліятэчнай апрацоўцы.

КАЛЕКТАР дапамагае бібліятэкам у справе прапаганды кнігі і па запатрабаваньні высылае рэкамэндацыйныя сьпісы.

ВЫДАВЕЦТВЫ: Белдзяржвыдавецтва, Дзяржвыдавецтва РСФСР, РВА ЦСПСБ, Цэнтрвыдавецтва народаў СССР

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзелка 21 кастрычніка „З 1-м красавіком" амэрыканская камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: культфільм у 3-х частках «ПАЛЯВАНЬНЕ НА ГАРЫЛУ»

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка 21 кастрычніка амэрыканскі фільм „Радыё і леў". Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 57. Пачатак а 7 гадзіне.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". З панядзелка 21 кастрычніка „Сэрца Азіі" кіно-нарыс у 6 частках. Звыш праграмы: цікавая камэдыя „Янка піанэр". Ка саадчынена ад 2 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" Новы фільм вытв. „Савкіно" „Каін і Арцем" драма ў 6 частках. Пачатак а 7 г. 15 хв.

ИЗДАТЕЛЬСТВО „ПРАВДА" ЦК ВКП(б)

БЕЛОРУССКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА НОЯБРЬ И ДО КОНЦА ГОДА

НА ВСЕ ИЗДАНИЯ ИЗДАТЕЛЬСТВА „ПРАВДА"

НАИМЕНОВАНИЕ ИЗДАНИЙ.	На 1 м-ц. Руб.	На 1 м-ц. К.	До конца года. Руб.	До конца года. К.
Газэта: „ПРАВДА"	1	—	2	—
„ „Рабочая Газета"	—	60	1	20
„ „Комсамольская Правда"	—	75	1	50
„ „Пионерская Правда"	—	20	—	40
Журналы: „Большевик"	—	40	—	80
„ „Коммунистич. Интернац."	1	—	2	—
„ „Революция и Культура"	—	80	1	60
„ „Под знаменем Марксизма"	1	50	3	—
„ „Раб.-крест. корреспонд."	—	30	—	60

НАИМЕНОВАНИЕ ИЗДАНИЙ.	На 1 м-ц. Руб.	На 1 м-ц. К.	До конца года. Руб.	До конца года. К.
Журналы: „Прожектор"	1	—	2	—
„ „Работница"	—	45	—	90
„ „Экран"	—	35	—	70
„ „Крокодил"	—	55	1	10
„ „Хочу все знать"	—	35	—	70
„ „Лицом к деревне"	—	30	—	60
„ „Вожак"	—	10	—	20
„ „Мурзилка"	—	40	—	80
„ „Огоньки" (детские)	—	15	—	30

ПОДПИСКА от фабрик, заводов, учреждений, воинских частей и др. коллективов ИСКЛЮЧИТЕЛЬНО ПРИНИМАЕТСЯ Белор. отделением „ПРАВДА" Минск, Советская, 61, тел. 8-21. Витебским п-отдел. „ Витебск, Ленинск. 11, тел. 96. Гомельским „ „ Гомель, Кооперативная, 12, тел. 1-94. и нашими штатными сотрудниками, снабженными соответствующими удостоверениями.

СВОЕВРЕМЕННАЯ СДАЧА ПОДПИСКИ ГАРАНТИРУЕТ АККУРАТНУЮ ДОСТАВКУ, а потому подписку необходимо сдать для исполнения: основную не позже 20 числа предподписного месяца, а дополнительную до 26-27 числа.

ПРИЕМ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ ПОДПИСКИ ПРОИЗВОДИТСЯ ОТДЕЛЕНИЕМ и П-ОТДЕЛЕНИЯМИ „ПРАВДА" а также Газетным Бюро и всеми газето-письмоносцами,

Белор. отделение Издательства „ПРАВДА".

Гр-ка Рэвека Абрамаўна Маскоўіч, якая паходзіць з гр-н хут. Крыкоўка Ратамскага с.-с. Менскругі зьмяняе сваё прозьвішча „Маскоўіч" на прозьвішча „Бозін".

Асобы, якія маюць прэтэнзіі супроць зьмены прозьвішча просьба паведаміць аб гэтым Ратамскі с.-савет, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Студэнцк. пасьведчаньне № 125 Кліменка Я.Ф., выд. праўл. с.-г. акадэм., кв. 39п.

— Дапрызыўная кніжка Яцкова М. І., выд. Гарэцкім ваенкаматам, кв. 39п.

— Сяброўскі білет саюза с.-гасп. і лясных рабочых за № 40690, выд. Гарэцкім райкомам на імя Асіповіча П. І., кв. 39п.

— Студэнцкае пасьведчаньне за № 751 Асіповіча П. І., выд. Белар. Дзярж. с.-гасп. акадэм., кв. 39п.

— Вайсковы білет Юр'ева М., выд. Гарэцкім ваенкамат. і стралковая кніжка, кв. 39п.

— Пайная кніжка Масалкава І. А., выд. дарожна-транспартн. спаж. т-вам, кв. 39п.

— Сяброўскі білет № 3189 Швара А.С., выд. саюзам папяровай прамысловасьці „Красная Звезда", кв. 39п.

— Сяброўскі білет № 6288921 Ганчарова Е.В.

— Залікавая кніжка за № 1994 Недасекіна М.І., выд. Гарэцк. с.-гасп. акадэм., кв. 39п.

— Дапрызыўная кніжка № 15 Юхневіча Д.П., выд. Гарэцкім ваенкаматам, кв. 39п.

— Чырвонаарм. прызыўная кніжка № 1363 Волкава Е.І., выд. Гарэцкім ваенкаматам, кв. 39п.

— Студэнцкае пасьведчаньне № 317 Цыганкова П.П., выд. Белар. с.-гасп. акадэм., кв. 39п.

— Сяброўскі білет за № 7107 Шэршнева І. І., выд. саюзам працаўн. зямлі і лесу, кв. 39п.

— Комсамольскі білет № 30966 Шэршнева І.І., выд. Полацкім акругкомам, кв. 39п.

— Пасьведчаньне ўзамен дапрызыўнай кніжкі за № 253 Шэршнева І. І., выд. канцэлярыяй акадэм. у 1929 г., кв. 39п.

— Асабовая кніжка Садоўскага К. М., выд. быўш. Веляцкім ВВК, кв. 49п.

— Дзьве вучотна-конскія кніжкі Садоўскага К. М., кв. 49п.

Ліквідацыйны балянс ЦЭНТРАЗЕМСКЛАДУ

АКТЫЎ НА 10 ВЕРАСЬНЯ 1929 ГОДУ. ПАСЫЎ

НАЗВА РАХУНКАЎ		СУМА
1. Грашовыя сродкі.		
Бягучыя рахункі	16341—97	
Каштоўныя паперы	10 —	16351—97
2. Таварныя сродкі.		
Тавары на хаваньні	4224—36	
Тавары на камісіі	487—59	4711—95
3. Маемасныя сродкі.		
Інвэнтар		5 —
4. Дэбіторы:		
Пакупнікі	47973—71	
Дастаўшчыкі і падрадчыкі	2899—56	
Наркамзем	16205—63	
Розныя асобы і ўстановы	20174—94	
Падсправаздачныя сумы	182—51	
Авансы служачым	113—64	*) 87549—99
5. Вэксалі: а) у партфэлі	35648—84	
б) пратэстав.	2441—75	38090—59
6. Няпэўныя і безнадзейныя даўгі		49478—87
7. Страты мінулых гадоў 26-27 г.	195840—76	
якія пакрываюцца запасн. кап.	77411—57	118429—19
8. Страты 1927-28 апэрац. году		94317—51
9. Страты за ліквідацыйны перыяд		302453—92
БАЛЯНС.		711388—99

НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА
Статутны капітал	533006—75
Стандартны фонд	12—54
Фонд пагашэньня няпэўных даўгоў	42253—91
Крэдыторы:	
Дастаўшчыкі і падрадчыкі 96402—42	
Пакупнікі 1491—40	
Розныя асобы і ўстановы 37421—11	
Падсправаздачныя сумы — 86	135315—79
Выдаткі канчатковай ліквідацыі ЦСГС	800 —
БАЛЯНС.	711388—99

*) З паказанай сумы руб. 87549—99 к. знаходзяцца ў судовых органах на руб. 29800—64 коп.

Старшыня ліквідкому ЦСГС СІДАРОВІЧ.

Галоўны бухгальтар СРЭДЗІНСКІ.

ПРЫБЫТКОВЫЯ СТРАТЫ.

Удзенкі (тавараў, маемасьці і інш.)	212518—85	
Розн. сьпіс па праверцы разьлікаў па рахунках дэбіторaў і крэдыторaў	7274—65	
Сьпісаньне безнадзейных даўгоў	1839—52	
Штрафы	7290 —	
Процанты і каміс.	9716—03	
Бягучыя выдаткі	70220—70	
Сальдо амарт. фонду		6604—64
Розныя выдаткі	198—81	
	309058—56	6604—64
Страты		302453—92
	309058—56	309058—56

Старшыня ліквідкому ЦСГС СІДАРОВІЧ.

Галоўны бухгальтар СРЭДЗІНСКІ.

Ліквідацыйны балянс і рахунак прыбыткаў і страт зацьверджан сталай камісіяй пры НКФ Бел. ад 2-га кастрычніка 1929 г. і да друку дазваляецца.

Інспэктар бюджэтнага кіраўніцтва НКФБ СТАЯНОЎСКІ.

Галоўлітбел 595. Друкарня БДВ.